Крушыняны ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Студзіводы ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 25 (2614) Год LI Беласток, 18 чэрвеня 2006 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Адкрыць Беларусь свету

„Ніва":— Па-першае, дзякуем за падтрымку „Нівы". Як Вы ацэньваеце прыгавор у нашай справе і як беларуская апазіцыя, грамадзяне Беларусі, беларускія ўлады ўспрынялі гэтае рашэнне?

Вінцук Вячорка: — Што да ўладаў, то паводле маіх звестак, ніякай рэакцыі не было. Можа, я што-небудзь прапусціў. Я думаю, што гэта добры знак, бо дэмакратычная грамадскасць, дэмакратычныя сілы, Народны фронт, успрынялі поўнае апраўданне з вялікай палёгкай. Нам вельмі залежала на тым, каб гэты незразумелы працэс не стаў прычынай сумневаў у справядлівай палітыцы да беларускай нацыянальнай меншыні, якую вядзе дэмакратычная, еўрапейская Польшча. І дэмакратычная справядлівасць трыумфавала. Гэта ёсць таксама праява салідарнасці беларусаў у Польшчы, у Беларусі і ў іншых краінах свету, што, на маю думку, вельмі важна для нас як для народа, які толькі цяпер аднаўляе сваё ўсведамленне на карце Еўропы. Я думаю, што ў гэтым сэнсе пераможны канец працэсу — самае сведчанне новае якасці беларускае салідарнасці.

— Зменім тэму. Аляксандр Мілінкевіч у апошні час штораз часцей кажа, што надыходзячы гаспадарчы крызіс у Беларусі паўплывае на тое, што Аляксандр Лукашэнка не датрывае да канца паўнамоцтваў. А якія канкрэтныя эканамічна-гаспадарчыя факты павінны здарыцца, каб гэтак сапраўды адбылося?

— Так, сапраўды наша стратэгія называецца антыкрызіснай, але нельга лічыць так, што мы чакаем крызісу і калі ўжо гэты крызіс будзе, вось тады дэмакратычныя сілы і перамогуць. Бяда для Беларусі ў тым, што крызіс ужо ёсць. Сістэмны. Гэта крызіс каштоўнасцей. Якраз крызіс каштоўнасцей вывеў тысячы людзей на вуліцы два месяцы таму. Гэта крызіс улады — яна ажыццяўляецца толькі сілай. Гэта знешнепалітычны крызіс — краіна ў ізаляцыі. Гэта эканамічны крызіс — ён ёсць ужо цяпер, і пра яго добра ведаюць дырэктары як прыкормленых дзяржавай прадпрыемстваў, так і так званых звычайных. Змена кан'юнктуры будзе азначаць, што гэты крызіс праявіцца па ўсёй сваёй шырыні. Лукашэнка да яго не гатовы, але прыняць выклік гэтага крызісу можна толькі адкрыўшы Беларусь свету — крэдытам, інвестыцыям, новым рынкам. А для гэтага трэба правесці свабодныя выбары. Вось гэта і ёсць наша стратэгія: давайце свабодныя выбары, інакш мы правалімся ў прорву!

— Як тады ў гэтым кантэксце трактаваць сцвярджэнне місіі Міжнароднага валютнага фонду, якая пасля візіту ў Беларусь рэкамендавала правесці рашучыя структурныя рэформы. Ці Аляксандр Лукашэнка паддасца гэтаму ўнушэнню?

— Ён зняважліва адгукаецца пра міжнародныя інстытуты, і пра ўсясветны банкі, і пра Міжнародны валютны фонд, і пра іншыя міжнародныя бізнесовыя і фінансавыя інстытуцыі, і нават пра усясветную гандлёвую арганізацыю, хоць не супраць быў бы туды патрапіць. Але ж разумее, што яго туды ніхто не возьме. Я мяркую, што любы спакойны, палітычна нематываваны спецыяліст убачыць жахлівы перакос у беларускай гаспадарчай сістэме, якая не мае гнуткасці, якая мае манапольную прывязку толькі да аднаго рынку, а менавіта ўсходняга. А гэта азначае, што нават нязначная змена газавай кан'юнктуры ці нават нязначная змена нашай здольнасці прадаваць нешта ў Расію прывядзе нас да катастрофы. Таму ўсё правільна — трэба структурныя змены, звязаныя з уласнасцю, а тым самым з павелічэннем дынамізму, гнуткасці і адказнасці бізнесу і прамысловасці. Сёння, калі Лукашэнка фактычна асабіста кіруе кожным заводам, гэтай гнуткасці быць не можа.

— Мінская праўрадавая прэса напісала, што вашы, спадара Мілінкевіча „экскурсіі" ў НАТА, Еўрасаюз з'яўляюцца жабраваннем заходніх грошай, значыць, благіх грошай.

— Гэта старая песня лукашэнкаўскай прапаганды, яна была, ёсць і будзе. Нашым найважнейшым заданнем, падчас нашых міжнародных паездак, ёсць данесці аб'ектыўную інфармацыю пра Беларусь і перад усім пра тое, што мы беларускі лёс маем намер вырашаць сваімі ўласнымі рукамі. Мы разумеем, што наш лёс ні ў якой іншай сталіцы не можа быць вырашаны. Нават нашы ворагі, калі мы ўпэўнена, адважна і ўмела павядзем за сабой народ, вымушаны будуць з гэтым змірыцца. Але калі будзе нарастаць падтрымка, матэрыяльная падтрымка незалежнай інфармацыйнай прасторы, напрыклад, Радыё Рацыя; тое, што яно ўзнавілася, гэта вялікі прарыў...

— І ідэя спадарожнікавага тэлебачання...

— ...і калі надалей будзе ажыц-

[працяг ☞ 5]

Фота Міры Лукшы

Вінцук Вячорка — старшыня Беларускага Народнага Фронту

„Незразумелы" час ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Сёлетнія вясна і пачатак лета халодныя ў Беларусі ў кожным сэнсе. Дажджы і вятры не дабаўляюць людзям настрою. Краіна перажывае перыяд нейкай халоднай грамадзянскай вайны, хоць пераважная бальшыня грамадства гэтага зусім не асэнсоўвае. Крытычная маса ўзаемнай нянавісці, можа стацца, давядзе да сур'ёзнага выбуху. А пакуль жа дзяржаўныя структуры будуюць дзіўны сімбіёз ленінскага сацыялізму з дзікім капіталізмам...

Нобелеўская прэмія для беларуса? ☞ 2

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Размаўляў я ў апошні час з праф. Уладыславам Барташэўскім, былым міністрам замежных спраў, несумненным аўтарытэтам, які ўсё жыццё непахісна і нескрыванымі поглядамі змагаўся за дэмакратыю, талерантнасць і з'яднанне паміж народамі...

Захаваць тоеснасць ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

Вучні Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім імя Яраслава Кастыцэвіча апошнім часам дабіліся шматлікіх поспехаў у разнародных конкурсах і спаборніцтвах. Пра бельскую „тройку" сталі таксама гаварыць пасля перамогі белгімназістаў (І месца) у фінале агульнапольскага конкурсу „Зацікаўленні ў рэгіёне" VII эдыцыі Школьнай турыстычнай біржы, якая праходзіла 20 мая ў Шчэціне...

Вяртаўся з франтоў ☞ I

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Мяне тады тут не было, бо ў лістападзе 1937 года я быў прызваны ў войска, а ў верасні 1939 года меў вярнуцца. Служыў я ў 27 палку уланаў імя караля Стэфана Баторыя. Мой полк стаяў у Нясвіжы і быў у складзе Навагрудскай брыгады кавалерыі; іншыя два палкі брыгады стаялі ў Навагрудку і Баранавічах. Недалёка Нясвіжа была дзяржаўная мяжа і людзі гаварылі, што тут польскі, а там бальшавіцкі лес. У нашай часці было больш хлопцаў з нашых старон, але адносна мала, бо на службу непадалёк савецкай граніцы беларусаў амаль не бралі...

9 770546 196000

„Незразумелы” час

Сёлетнія вясна і пачатак лета халодныя ў Беларусі ў кожным сэнсе. Дажджы і вятры не дабаўляюць людзям настрою. Краіна перажывае перыяд нейкай халоднай грамадзянскай вайны, хоць пераважная бальшыня грамадства гэтага зусім не асэнсоўвае. Крытычная маса ўзаемнай нянавісці, можа стацца, давядзе да сур’ёзнага выбуху. А пакуль жа дзяржаўныя структуры будуюць дзіўны сімбіёз ленінскага сацыялізму з дзікім капіталізмам. Зразумець сутнасць сённяшняга ладу збоку надзвычай цяжка. Знешне ўсё выглядае зусім абсурдна. З аднаго боку застой у эканоміцы, мізэрныя заробкі ў многіх катэгорый насельніцтва. З іншага — прыстойны знешні выгляд беларускіх гарадоў, які адзначаюць і заўважаюць практычна ўсе госці нашай краіны, перапоўненыя (нават у буднія дні!) рэстараны і кавярні. Адкуль дзяржава бярэ грошы на масавыя відовішчы для народу, больш-менш вядома. Адкуль жа грашовыя знакі з’яўляюцца ў кішэнях яе грамадзян, зразумець цяжкавата. Што адбываецца — рост матэрыяльнага жыццёвага роўню, ці нейкі масавы адчай сцвярджаць не стану. Але народныя гулянкі ідуць бесперапынна — і гэта факт бясспрэчны.

У Гродне адбыўся чарговы фестываль нацыянальных культур. Зноў жа, для адных ён стаўся чарговым прапагандысцка-савецкім мерапрыемствам пад замшэлымі дэвізамі кшталту колішніх камуністычных слоганаў „пятнаццаць рэспублік — пятнаццаць сяцёр”. Іншыя ўспрынялі фестываль як магчымасць адпачыць, не ўдумваючыся асабліва ў змест і формы. Было даволі тлумна, цесна і страката. Кажуць, што знайшлося месца і для культуры тытульнай нацыі. Праўда, беларуская актыўная супольнасць гэтага не адчула.

Апазіцыя абвесціла пра стварэнне новага руху „За свабоду”, але адзінства ў яе шэрагах толькі паменела. Кааліцыя, якая з’яднала падчас так званых прэзідэнцкіх выбараў стракатыя партыі і рухі, напэўна зараз распадзецца. Левыя пойдуць улева, правыя — у адваротны бок ці застануцца на месцы. Самае горшае ў тым, што практычныя напрацоўкі рэгіянальных апазіцыйных сіл у значнай ступені страцяцца. А з іншага боку, усё заканамерна — падобнае цягнецца да падобнага, а ідэйныя каштоўнасці вызначаюць палітычныя прыярытэты і мэты.

„Палітычныя” працэсы, распачатыя падчас выбарчай кампаніі, выходзяць на свой пік. Шырокага грамадскага рэзанансу, на жаль, яны ўжо не маюць. Напярэдадні галоўны суд — над нядаўнім кандыдатам у прэзідэнты Аляксандрам Казуліным. Гэты працэс і яго вынікі могуць істотна паўплываць на хаду найбліжэйшай гісторыі Беларусі. Масква працягвае актыўна „заломваць рукі” Аляксандру Лукашэнку. І, як толькі надарыцца зручны момант, пастараецца памяняць кіраўніцтва ў Беларусі. Калі ж у дадатак да „выбараў” у мясцовыя саветы (пра іх ужо аб’явілі), будзе прышчэплены рэферэндум пра аб’яднанне з Расіяй, тады і пачнуцца сапраўдныя падзеі.

А пакуль значна цікавейшыя справы адбываліся ў Крыме, дзе фанатыкі Савецкага Саюза на чале з істэрычнай Наталляй Вітрэнкай апантана змагаліся з натаўскім дэсантам. Пэўны водгук гэта набыло на ўсёй постсавецкай прасторы. Але чакаць асаблівай грамадзянскай актыўнасці ў летні час не даводзіцца. Больш заможныя выпраўляюцца ў круізы на адпачынак, бяднейшыя распаўзаюцца па агародах і лецішчах. Да таго ж надышоў чэмпіянат свету па футболе і бальшыня мужчын на месяц, як і ў многіх іншых краінах, будзе прыкута да тэлевізараў. Цікава прасачыць за заўзятарскімі прыярытэтамі беларусаў. Паводле інтэрнэт-апытанняў найбольш адсоткаў людзей будзе хварэць за украінцаў, далей найбольшымі сімпатыямі ў нашых суайчыннікаў карыстаюцца зборныя Англіі, Бразіліі, Італіі і Нідэрландаў. Цікава, што нягледзячы на прапагандысцкія страшылкі пра „аранжавых злачынцаў”, адукаваныя беларусы сімпатызуюць паўднёвым суседзям. Упершыню стала шкада, што не трапіла ў фінальную частку чэмпіянату зборная Расіі. Хацелася б параўнаць які адсотак прагаласаваў бы за расійцаў у параўнанні з украінцамі. Мяркую, што лічбы былі б блізкімі. Прыхільнікаў зборнай Польшчы ў Беларусі няшмат. Зрэшты, пераносіць наўпрост футбольныя сімпатыі на палітычныя не варта. Хоць класік і сказаў: „Што нам жыццё?! — Гульня!”

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Наша піраміда

22 чэрвеня прыходзіць 65-я гадавіна разліву другой сусветнай вайны па ўсходзе Еўропы. Гэтай даце не адводзіцца столькі ўвагі, колькі дзевятаму дню мая — гадавіне, калі гэтая вайна ў Еўропе завяршылася. У шматтыражных апісаннях згаданай вайны, якія выдаваліся ў нашай геапалітычнай прасторы, майская дата асацыюецца з перамогай, а чэрвеньская — з „вероломным нападением”.

Але ці тое нападзенне было сапраўды вераломным? Хаця таталітарныя саюзнікі салідарна падзялілі нашу частку Еўропы, але не на векі вечныя; абодва дыктатары паціху думалі пра большае. І калі Гітлер даволі адкрыта праводзіў свае планы, у той час Сталін такою задумай не хваліўся, толькі рашыў справакаваць Гітлера да нападзення на ўсход. З гэтай мэтай было мабілізавана на граніцу вялікае савецкае войска і ў той жа час дзеля спакушэння нямецкага нападзення баяздольнасць таго войска была даведзена, у сакрэтнасці палішыняля, да мінімальнага ўзроўню. Спакуса задзейнічала і нямецкае войска маланкава наносіла савецкаму агромныя страты.

Здавалася б, што такому асвятленню пачатку вайны няма элементарнай логікі, бо столькі ж гадоў тыя тыражы, а вельмі часта і мы самі, даўбанілі ў нашы галовы, што Сталін быў геніяльным палкаводцам. Чаму ж ён дапусціў да такога правалу, да дзесяткаў мільёнаў людскіх ахвяр? Ён жа, як паказваюць раскрытыя ў апошніх гадах крамлёўскія сакрэты, пра дату германскага нападзення ведаў з дакладнасцю да гадзіны...

Дзеля высвятлення гэтага, здавалася б, парадоксу трэба вярнуцца ў ранейшыя гады, у гады вялікага тэрору, калі ў Савецкім Саюзе было рэпрэсаваных каля дваццаці мільёнаў чалавек, з чаго сем мільёнаў смяротна. Гэтыя жудасныя лікі, нават у крайне таталітарнай сталінскай сістэме, варта было прыхаваць пад дыван. І гэтым дыванам мелі стаць чарговыя мільёны, але ўзваленыя на чужы карак.

Быў тут і іншы разлік. Сталін, крывавы дыктатар, падставіўшы насельніцтва сваёй дзяржавы пад гекатомбу, станавіўся разам з культурным светам у адзін шэраг ахвяр агрэсара, пры тым, дзякуючы жахлівым стратам, на ганаровае месца. І той культурны свет, які з такім даверам ставіўся ў Мюнхене да Гітлера, са спачуваннем і з яшчэ большым даверам паставіўся да Сталіна. Мала, што Сталін атрымаў вырашальную ваенную дапамогу,

але ў парадку пасляваеннага размеркавання свету атрымаў ён у свой кулак палову Еўропы, а да таго амаль усіх ягоных апанентаў, што ў Вольным Свеце шукалі ад яго ратунку. Ды на Захадзе шматлікія людзі захапіліся ягонай асобай, зусім не прымаючы ва ўлік дзесяткаў мільёнаў ягоных ахвяр; вольныя людзі таксама захацелі мець куміра.

З другой сусветнай вайны Сталін выйшаў вялікім пераможцам, але тую перамогу атрымаў ён галоўным чынам не так у гучны дзевяты дзень мая, як ціхім падлогам у дваццаць другі дзень чэрвеня.

Але чаму мы пра гэта не чуем? Чаму гісторыкі апошняй у нас вайны мінаюць асвятленне яе пачатку шырокім колам, вялікімі тэкстамі распісваючыся адно пра подзвіг савецкага народа? Бо гэты подзвіг быў, ён неаспрэчны, праўдзівы. І гэты подзвіг адначасна з’яўляецца свайго роду фігавым лістком, за якім прыхаваўся генералісімус генацыду.

А кім з’яўляюцца галоўныя гісторыкі гэтай вайны, што пачалася ў чэрвені? Мова тут пра савецкую тэрыторыю і цвет тамашніх даследчыкаў. Гэта амаль выключна ваенныя чыны, якія службова падлягаюць вярхоўным камандуючым, найчасцей прыхаваным паклоннікам Сталіна. І як яны могуць згадваць, што дыктатар можа зрабіць са сваім насельніцтвам што толькі захоча? З нагоды сёлетняй гадавіны дзевятага мая Аляксандр Лукашэнка загадаў сваім слухачам даць адпор „фальсіфікатарам гісторыі”.

Рэтуш іміджу Сталіна за час вайны абышоўся савецкаму насельніцтву, паводле некаторых ацэнак, у пяцьдзесят мільёнаў смяротных ахвяр. А колькі людзей пакалечана, пазбаўлена блізкіх, кармільцаў, даху над галавой?

У 1387 годзе Тамерлан загадаў абезгаловіць семдзесят тысяч жыхароў Ісфагана і з іх галоў пабудаваць піраміду. І Сталін, загадваючы правал пачатку вайны, таксама паставіў сабе піраміду, у тым ліку і з нашых як жа даверлівых галоў.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Нобелеўская прэмія для беларуса?

Размаўляў я ў апошні час з праф. Уладыславам Барташэўскім, былым міністрам замежных спраў, несумненным аўтарытэтам, які ўсё жыццё непахісна і нескрываныі поглядамі змагаўся за дэмакратыю, талерантнасць і з’яднанне паміж народамі. Крануў я Беларусь. Прафесар, амаль як калісь Сакрат Яновіч, да якога прыліпла ў прэсе акрэсленне „вядомы пісьменнік з Крынак”, пераконваў:

— Для большасці краін у свеце Беларусь гэта абстрактная ўява. Думаюць, што гэта нейкая там частка Расіі, дзесьці „там”, чаму іх мае яна цікавіць? Трэба ўздзейнічаць не толькі на форуме Еўрасаюза, але таксама ААН і ўсялякіх міжнародных арганізацый, тлумачыць сітуацыю Беларусі.

Цяжка, вядома, не пагадзіцца з Уладыславам Барташэўскім. Думаю, сабе, аднак, што каб тое ўсё было паспяховым, тое ўспомненае ім уздзейнічанне мусіць мець міжнародны характар, чутны не толькі на форумах разнавідных арганізацый ды іх эліт, але таксама і грамадстваў. Несумненна, такую ролю выконвае Шведская каралеўская акадэмія, прысуджаючы штогод Нобелеўскую прэмію, таксама і ў галіне міру. Група дэпутатаў з Нарвегіі да сёлетняй Нобелеўскай прэміі ў галіне міру намінавала Алеся Бяляцкага, шэфа Беларускага цэнтра абароны правоў чалавека „Вясна”. Калі б атрымаў ён гэтую ўзнагароду, быў бы гэта выразны сігнал, што свет не пагаджаецца на парушанне правоў чалавека, антыдэмакратычныя паводзіны, ігнараванне свабоды ў Еўропе, але і не толькі на гэтым кантыненце. У інтэрв’ю, якое Алесь Бяляцкі даў Марціну Рэмбачу на сайце *www.bialorus.pl*, сказаў ён штосьці, у што павінны ўслухацца шведскія акадэмікі:

— Найбольш не хапае беларускаму грамадству і чаго найбольш прагне беларускае грамадства, гэта свабода. Гэта якраз той фактар, за які ідзе найцяжэйшае змаганне грамадства з уладай.

Нобелеўская прэмія для Алеся Бяляцкага ўпісвалася б таксама ў пэўную традыцыю. У хвіліны цяжкія і прадказваючыя здзяйсненне ў найбліжэйшых гадах пераломаў у недэмакратычных краінах прэмія ў галіне міру падтрымлівала сімвалы кантэстуючых рухаў. Вось хоць бы змагаючагася з апартэідам Нелсана Мандэлу; у палове сямідзесятых расійскага дысідэнта Андрэя Сахарава ці ў 1981 г. правадыра „Салідарнасці” Леха Валэнсу. Сам Алесь Бяляцкі перакананы ў гэтым, што раней ці пазней беларус атрымае мірную Нобелеўскую прэмію. Аднак у размове з мінскай „Нашай Нівай” агаварыўся:

— Але гэта не буду я. Атрымае яе прадстаўнік дакладных навук.

Можна тут паразважаць. Можа, меў бы гэта быць сённяшні лідэр беларускай апазіцыі, фізік Аляксандр Мілінкевіч, а можа ягоны калега па прафесіі, першы прэзідэнт незалежнай Беларусі Станіслаў Шушкевіч. Гэты апошні, дарэчы, нядаўна быў ушанаваны ў Вроцлаве ўзнагародай імя Яна Новака-Езяранскага — шматгадовага дырэктара секцыі Радыё Вольная Еўропа, якая назначаецца па ініцыятыве м.інш. Калегіума Усходняй Еўропы. У склад капітула гэтай узнагароды ўваходзяць таксама папярэднія лаўрэаты Тадэвуш Мазавецкі і Джордж Буш старэйшы. Станіслаў Шушкевіч узнагароджаны „за ўдзел у працэсе ліквідацыі СССР і будаванне свабоднай і дэмакратычнай Беларусі”. Так ці інакш, мірная Нобелеўская прэмія належыцца без сумнення прадстаўніку беларускага дэмакратычнага свету, свету, які змагаецца з рэжымам, з — як гэта моцна адзначыў у размове са мною праф. Барташэўскі — дыктатурай. „Апошняй дыктатурай Еўропы”.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Мячэці ў культавых мэтах ужываюцца толькі пры нагодзе большых святаў. Тады і ў Крушыняны, і ў Багоннікі адначасна з'язджаюцца вернікі з усяе Польшчы; ёсць яшчэ мячэць у Гданьску. У Беластоку ёсць два малітоўныя дамы...

Крушыняны мяняюць сваё мінулае

У Крушынянах аўтобус пакідае некалькі асоб, што вярнуліся з пакупкамі з Крынак. Падчэпліваюся да пажылае жанчыны з напалову напоўненай пакупкамі торбай, распытваю пра тамашнюю мячэць. А яна нічога не хоча сказаць, гаворыць, што нічога не ведае. Спачатку адказвае мне па-беларуску, але неўзабаве пераходзіць на важнейшую дзяржаўную мову, на мову, за якой уяўляе аўтарытэт, сілу, ці нават свайго роду пагрозлівасць. Пачынаю пшэкаць і я, але жанчына штораз шчыльней адгароджваецца ад мяне універсальнай бранёй няведання. Дапамогу мне аказваюць дзве маладзічкі, што ідуць непадалёк, інфармуючы, дзе жыве апякун займальнага мне храма. Здарылася гэта ў той момант, калі мы праходзілі насупраць мячэці, яны заўважылі, што яе дзверы раскрыты, і паведамілі, што той апякун павінен быць каля храма.

І сапраўды, калі я падышоў да мячэці, з яе выйшаў даволі малады чалавек. На той час да храма пад'ехала на веласіпедах пара нямецкамоўных турыстаў. Апякун, Джэміль Гэмбіцкі, успеў сказаць мне некалькі слоў, а затым усе мы разбуліся і ўвайшлі ў сярэдзіну. Чужаземцам крушынянскі гід прабаваў расказваць па-англійску, але ягоны лексічны запас гэтай мовы быў даволі сціплы.

Паколькі я загадзя паведаміў спадара Гэмбіцкага, што буду цікавіцца зацікаўленнем мячэццю ў турыстаў, ён спытаў мяне, дзе яму пра гэта расказваць: у сярэдзіне храма ці навонкі. Мяне гэта здзівіла, бо сам лічу, што сакрум трэба зберагаць і аддзяляць ад агульнай штодзённасці; магчыма, што мусульмане рукатворнай мячэці не лічаць асаблівай святасцю. Выйшлі мы на лавачку, што перад уваходам.

Сам спадар Гэмбіцкі жыве ў Беластоку, толькі на турыстычны сезон мусульманская абшчына даверыла яму дзяжуры ў мячэці на працягу летняга сезона, які ахоплівае яшчэ і вясну, і кавалак восені; з вёскі няма каго ўзяць, бо тут жывуць толькі дзве мусульманскія сям'і. Мячэць можна наведваць ад дзевятай да васемнаццатай гадзіны, штодзённа. Турысты прыязджаюць па-рознаму, найбольш было нядаўна ў доўгі красавіцка-майскі уік-энд — каля чвэрці тысячы. Прыязджаюць турысты індывідуальна і ў групах, агранізаваных турыстычнымі агенцтвамі. Часам прыедзе тры экскурсіі ў дзень, часам адна, а часам не з'явіцца ніводная. Турысты найчасцей прыязджаюць з далейшых старонак краіны: са Шлёнска, Велькапольскі, бываюць нават з Нямеччыны. Здараецца, што прыязджаюць наведвальнікі з ісламскіх краін — пры нагодзе сустрэч у рамках мусульманскай абшчыны. У Крушынянах сваіх пакойнікаў хаваюць чачэнцы, якіх у Беластоку каля паўтысячы.

Мячэці ў культавых мэтах ужываюцца толькі пры нагодзе большых святаў. Тады і ў Крушыняны, і ў Багоннікі адначасна з'язджаюцца вернікі з усяе Польшчы; ёсць яшчэ мячэць у Гданьску. У Беластоку ёсць два малітоўныя дамы: па вулі-

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Мячэць у Крушынянах

цах Гетманскай і Грыбовай. На згаданыя святы не ўсе вернікі змяшчаюцца ўнутры храма. Пры такіх нагодах мусульмане наведваюць магілы сваіх блізкіх. У Польшчы ёсць тры мізары — мусульманскія могілкі: у Крушынянах, Багонніках і ў Варшаве. Калі нехта ў глыбінцы памрэ, яго цела прывозяць хаваць побач сваякоў.

На крушынянскай драўлянай мячэці два бакавыя, нераздзельныя з галоўным храмам, мінарэты і аздобная вежка пасярэдзіне даху. Гэтакая архітэктурная адметнасць узялася з таго, як патлумачыў мне спадар Гэмбіцкі, што будавалі яе мясцовыя майстры паводле сваіх уяўленняў і таму звонку будынак мясцовай мячэці шмат у чым нагадвае хрысціянскія храмы. З мінарэтаў муэдзін заклікае вернікаў толькі ў найбольшыя святы. Нядаўна быў перакрыты дах мячэці; усё гэта адбылося на кошт вернікаў. Магчыма, што крушынянскі храм будзе хадайнічаць за нейкімі еўрасаюзнымі сродкамі на культурную спадчыну; паводле спадара Гэмбіцкага для мячэці ў Багонніках такія захады ўжо зроблены. Нядаўна надлясніцтва ў Пачапку паставіла новую браму з боку крушынянскай вуліцы.

Мізар знаходзіцца ў нейкіх двухсот метрах ад мячэці; ён прагрэсіруе з поўначы на поўдзень. Найранейшыя намагільнікі каменныя — па два камяні: меншы камень ад ног, большы ад галавы. Найстарэйшы ўстаноўлены вучонымі намагільнік у Крушынянах датуецца 1744 годам. Новыя намагільнікі ўжо кшталтам такія самыя, як на цяперашніх хрысціянскіх могілках. Пахаваны тут неардынарныя людзі, напрыклад, колішні мэр Скідаля, чыноўнікі, юрысты. На ранейшых камянях звонку высякаліся эпітафіі кірыліцай у царскі час і лацінкай пазней. Цяпер з'яўляюцца надпісы ад магілы, часта арабскім шрыфтам; гэта стала магчыма з прымяненнем камп'ютэрнай тэхнікі. Хаваюць пакойніка не ў труне, а ў саване, абстаўляючы яго дошкамі з аднаго боку вертыкальна, а з другога паката.

Побач мячэці мемарыяльны камень, які інфармуе, што кароль Ян Сабескі вызначыў татарам сяліцца ў вёсках Крушыняны, Нетупа і Лужаны... У Крушынянах ёсць яшчэ невялікая царква на мясцовых праваслаўных могілках. Праз нейкі час у былым школьным будынку адбываліся і каталіцкія малебны, але не прыняліся. Цяпер той будынак з'яўляецца прыватнай уласнасцю ды прапануе начлегі і харчаванне. Яшчэ ў мінулым годзе, калі жыў яго новы ўласнік, тут штодзённа былі госці; пасля ягонай смерці жонка і сыны таго руху не здолелі ўтрымаць.

Ад мячэці падаўся я паглядзець на крушынянскае наваколле. Турдаведнікі паведамляюць, што з боку Саннік ёсць вышка, з якой можна наглядаць даліну ракі Нетупы; падаўся я ў яе напрамку. Жвіроўкай, што ад Крушынян да Саннік, праехаў раней грэйдэр, пакідаючы пасля сябе заміж калдобін шмат вырваных з дарожнага палатна камянёў. Да дарожкі ў напрамку вышкі я сам скінуў на абочыну мо з дваццаць такіх дарожных скулаў, вагой ад аднаго да пяці кілаграмаў.

Насупраць дарожкі да вышкі пры шашы аўтастаянка; да вышкі дазволена хадзіць толькі пяшком. Дарожка пралягае сярод пасадак хваіны і бярэзіны. Па хвойках палічыў я, што лес пасаджаны там дваццаць тры гады таму, у 1983 або, можа, у 1982 годзе. Значыць, раней, акурат у славуты геркаўскі час, тут палі былі запушчаны ў аблагі. Той перыяд, які так хваляць нашы сяляне, даў найбольшы разгон уцёкам вясковага насельніцтва ў гарады. Вялікая прастора між Крушынянамі і Саннікамі, на якой раней расло збожжа, у той час апусцела. Са згаданай назіральнай вышкі раней можна было аглядаць панараму тае прасторы. Цяпер малады лес параўняўся з вышкай і з яе відаць адны толькі вяршкі дрэў, мора лесу па край краявіду. Узбярэжжа Нетупы адведзена пад запаведнік баброў і чалавек, які раней там араў і касіў, сёння ўжо не можа туды ўбіць і носа.

Вярнуўся я ў Крушыняны. Каля аднаго плота гутарылі дзве жанчыны: ад „дзялкі" — гарадскога выгляду, ад вуліцы — вясковага. Падышоў я да іх, гутарка паміж імі ішла па-польску. Але калі вясковая жанчына адышла да свайго панадворка, загутарыла з мужам па-свойму. І я крыху прыстаў да іх. І даведаўся, што ў Крушынянах цяпер асталося жыць не больш пятнаццаці душ. Зямлю абрабляе чатырох сялян; паказалі мне яны свайго суседа. Я здзівіўся, бо ён ледзь цягнуў касу, збіваючы траўку на панадворку.

— Гэта ягоны сын абрабляе, — патлумачылі мне.

А большых гаспадароў двух, але і яны памяркоўныя. Калі я запытаў пра раней бачаную мною кабылу з жарабяткам, адказалі мне, што гэта адзіныя коні ў вёсцы. Аднак калі я згануў, што бачыў яшчэ ў бакавой вулачцы і каня запрэжанага ў воз, дадалі яшчэ таго аднаго каня. Згаданыя коні мясцовай традыцыйнай, цяжкай пароды. А ўжо з боку Лужан пасвіцца некалькі коней лёгкай арабскай пароды; мабыць, чакаюцца там турысты.

На некалькіх панадворках „скальнякі", якія, здаецца, становяцца ў нас тым бытавым стандартам, якім раней былі насценныя ландшафты з лебедзямі і аленямі. На адной з хат вялікі надпіс „Złota Orda". Да іншага панадворка брама з месячным сярпом, за ёю хата, якая прапануе татарскае меню; што дакладна прапануе тая кухня, я ўжо з-за нястачы часу не пацікавіўся. Аднак, паколькі не было нідзе ў вёсцы відаць авечак, думаю, што тыя стравы не занадта татарскія. Яшчэ ў адным месцы абнаўляецца хата, якая атрымоўвае каміны і стрэхі даволі экзатычнага кшталту, якія мне больш асацыяваліся з афрыканскай глыбінкай, чымсьці з еўразійскай прасторай. Агароджа тае хаты аздоблена контурамі, стылізаванымі ці то на Самарканд, ці то на Маракеш. Пагоня за экзотыкай, здаецца, не мае тут межаў і не здзівіла б мяне хіба, калі б хто ў Крушынянах пабудаваў нават хмарачос.

Калі я ўжо чакаў аўтобуса, да прыпынку цяжка падышоў, на дзвюх мыліцах, пажылы мужчына.

— Калісь вёска распасціралася на два кіламетры і поўна было народу, поўна моладзі, — сказаў ён мне. — А сёння няма да каго адазвацца. Часам выйду толькі на лавачку і пагляджу адно на сваю хату.

Прыехаў аўтобус і я развітаўся з ім. Мо калі б ён прыйшоў раней, калі б было больш часу, ён можа сказаў бы мне і нешта больш сумнае пра сваю вёску.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Катлы з Гайнаўкі

Першы такі кацёл з назвай „Мадэратар” зрабілі ў слесарскім прадпрыемстве цеплавой энергетыкі Казіміра Кубацкага ў Гайнаўцы ў 1981 годзе. Тады — 25 гадоў таму — у карыстанні былі перш-наперш катлы на вугаль. Інжынер Казімір Кубацкі зрабіў кацёл на драўляныя адкіды, тады ў Гайнаўцы былі вялікія адвалы на лесапільных заводах. Кацёл гэты быў наватарскай канструкцыі.

Усё большыя заказы паўплывалі на тое, што за прадукцыю катлоў узяўся сын Казіміра Кубацкага — Мар’юш. Цяпер яго фірма выпускае 380 катлоў у месяц. Частку іх высылаюць у Германію.

Катлы з Гайнаўкі дастасаваныя да еўрасаюзных патрабаванняў для такога роду награвальнага абсталявання. Многае што ў іх мадэрнізавалі, дадалі абсталяванне „Дракон”, абапіраючыся на фінскай тэхналогіі, для аўтаматызацыі працэсу загрузкі катла.

* * *

Сёлета ўлады Гайнаўкі намецілі да рэалізацыі шматлікія інвестыцыі, у тым ліку, мадэрнізацыю паверхні гарадскіх вуліц.

У розных раёнах горада пачнецца аднаўленне вуліц: Кнеўскага, Мілай і Лагоднай, Падлясе і Спадовай, Заенчай, Лабэндзяй і Жабяй, Металёвай ды адрэзка вуліцы Гурнай.

У далейшым будзе праводзіцца пабудова вуліц Баторыя і Ракавецкага. Тут працы пачалі ў 2005 годзе.

Будзе больш тратуараў. Пракладуць іх па вуліцах: Доўгай, Мілкоўскага і Арміі Краёвай.

У наступным годзе плануюць мадэрнізаваць паверхню чарговых гайнаўскіх вуліц: Тарговай, Адлеглай, Стшалецкай, Вясновай, Летняй, Пагоднай і Ютшэнкі. Зараз у падрыхтоўцы тэхнічная дакументацыя на выкананне гэтых прац.

(мох)

Шэршня не любяць

Здольныя людзі з паэтычным прызваннем, якія не церпяць фальшу і крывадушнасці, падпісвалі свае творы псеўданімам „Шэршань”. Яны сваім крытычным вершам маглі аж да крыві ўкусіць нейкага бюракрата ці іншага асобеня з цёмнаю душою, ласага толькі да пахвал.

Перад вайною жыў на Беласточчыне беларускі паэт, які свае вершы, што былі накіраваны супраць шэрсці і ветру, падпісваў псеўданімам „Шэршань”; друкаваліся яны ў міжваеннай прэсе. Варта было б, каб „Ніва” ўсе тыя вершы сабрала і пачаргова друкавала на сваіх старонках.

Быў і другі „Шэршань”, які свае цікавыя вершы прысылаў у „Ніву”, і яна іх друкавала; быў гэта наш слаўны Дзядзька Квас. Ягоных вершаў няма патрэбы паўтараць у „Ніве”, але варта было б іх надрукаваць кніжным выданнем. Хаця сёння яны мо ўжо не надта модныя, аднак маю ініцыятыву прапаную разважыць.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Захаваць тоеснасць

Дзяўчаты і Тамаш Таранта рашыліся паказаць багацце беларускай і суседніх культур

Вучні Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім імя Яраслава Кастыцэвіча апошнім часам дабіліся шматлікіх поспехаў у разнародных конкурсах і спаборніцтвах. Пра бельскую „тройку” сталі таксама гаварыць пасля перамогі белгімназістаў (I месца) у фінале агульнапольскага конкурсу „Зацікаўленні ў рэгіёне” VII эдыцыі Школьнай турыстычнай біржы, якая праходзіла 20 мая ў Шчэціне. Важна, што бельскія белгімназісты дабіліся поспехаў, паказваючы багатую традыцыю і гісторыю продкаў. Мае суразмоўцы перакананыя, што яны не перамаглі б, калі б жылі ў аднародным польскім асяроддзі. Бельская моладзь верыць, што іх козыр і сіла заключаюцца ў культурнай адметнасці і разнароднасці, якія вылучалі іх з польскага маналіту.

— Многія выхадцы з нашых вёсак, якія апынуліся ў гарадах, адарваныя ўжо ад каранёў. Мы захапляемся сучаснай тэхнікай і камп’ютэрамі, а забываем аб сваёй культуры і традыцыях. Часта ірвемся да амерыканскай культуры, захапляемся японскім, а забываем аб сваім родным, якое не горшае за баварскае ці тыральскае. Наш хлеб з хатняй печкі ці бульбяная кішка не горшыя за гамбургеры і радуе мяне, што гэта пачала заўважаць наша моладзь. Яшчэ прыйдзе час, што маладыя людзі стануць належным чынам ацэньваць лён, воўну і будуць захапляцца мясцовай прыродай, — з роздумаў пачынае размову дырэктар „тройкі” Васіль Ляшчынскі.

Вучні, якія ездзілі ў Шчэцін і дабіліся перамогі ў маштабе краіны, з вялікай пашанай гавораць аб гісторыі свайго горада і беларускай культуры, якая перапляталася ў Бельску-Падляшскім з іншымі традыцыямі. Мае суразмоўцы рады, што ўмеюць гаварыць па-свойму і ў школе вучацца беларускай літаратурнай мове.

— Перад усім трэба ведаць сваю мову. Многія маладыя людзі з беларускага асяроддзя гавораць толькі на польскай мове і не ўмеюць гаварыць па-свойму. Бацькі думаюць, што лепш будзе, калі іх дзеці вывучаць англійскую ці французскую мовы, чым навучацца гаварыць на роднай гаворцы, — кажа Ганна Мордань, якая разам з сяброўкамі паказвала народную беларускую культуру ў Шчэціне.

— Трэба ведаць беларускую мову, каб можна было захаваць нацыянальную тоеснасць. Мы навучыліся гаварыць па-свойму і гэта не перашкаджае нам знаёміцца з іншымі мовамі, — гаворыць Ева Шырэнас. Мае маладыя суразмоўцы кажуць, што яны на беларускім дыялекце размаўляюць са сваімі бацькамі і дзядулямі.

Дзяўчаты разам са сваімі апекунамі-настаўніцамі пачынаюць расказваць пра ход агульнапольскага мерапрыемства, на якое трапілі пасля перамогі ў Беластоку.

— Падрыхтавалі мы на конкурс тэатральную сцэнку з беларускімі песнямі і танцамі. Расказвалі пра гісторыю нашага шматкультурнага Бельска. Размаўляючы па-свойму, прадставілі мы „Гуканне вясны”. Гэтую сцэнку рыхтавалі яшчэ пад беластоцкія спаборніцтвы і не рашыліся ўжо вучыцца новаму, — расказваюць дзяўчаты і настаўніцы Альжбета Навацкая і Валянціна Сцепанюк, якія ездзілі з вучнямі ў Шчэцін. Публіцы спадабаўся народны танец „Падыспан” у выкананні дзяўчат і мясцовыя стравы, якімі дзяўчаты частавалі сабраных.

У іншым агульнапольскім конкурсе „Рэгіён у пачуццях”, які таксама праходзіў у Шчэціне ў рамках турыстычнай біржы, бельскія белгімназісты занялі чацвёртае месца. Падрыхтавалі яны свой куточак у выглядзе даўняй хаты, які меў паказаць традыцыі спалучаныя з сучаснасцю. У цэнтральным месцы апынуліся там праваслаўныя іконы з лампадкай. На экспазіцыі былі змешчаны дэталі, якія спасылаліся на гісторыю горада і мясцовыя традыцыі. Вучні, пераапранутыя ў даўняе адзенне, каб прыцягнуць публіку да сваёй экспазіцыі, спявалі беларускія і польскія песні і частавалі сабраных, між іншым, бульбяной кішкай і буславымі лапамі.

— Мы перад усім звярталі ўвагу на шматкультурнасць і традыцыі. Хацелі паказаць тое, чаго яшчэ ў Польшчы не бачылі і гэтым самым зацікавіць конкурсную камісію, — гаворыць Юліянна Дораш. — Трэба памятаць аб сваіх традыцыях, каб магчы пасля расказаць аб іх сваім дзецям і захаваць іх ад забыцця.

— Мы, рыхтуючыся да конкурсу, многа даведаліся аб сваім мінулым і гісторыі горада, — кажа Караліна Ігнацюк.

— Апрача гісторыі мы рашыліся паказаць сучаснасць і культурную дзейнасць у горадзе. Нашу экспазіцыю ацэньвала прафесійная камісія, якая звяртала ўвагу на розныя дэталі, — гаворыць настаўніца Альжбета Навацкая. Інфармуе яна пра вартасныя ўзнагароды — дзве экскурсіі па Польшчы, якія атрымалі бельскія вучні, дабіваючыся поспехаў сярод 20 гімназічных і сярэдніх школ, пераможцаў ваяводскіх адбораў.

Частка дзяўчат, якія ездзілі ў Шчэцін, займаецца ў тэатральнай групе „Антракт” пры Бельскім доме культуры пад наглядам Альжбеты Фіёнік і наведвае Музей малой айчыны ў Студзіводах, дзе знаёміцца з мінулым і беларускімі традыцыямі. Тамаш Таранта быў адзіным хлопцам у бельскай камандзе і іграў на акардэоне пад народныя песні.

— Я ў „Антракце” займаюся з трэцяга класа падставовай школы і менавіта там знаёмлюся з народнымі традыцыямі і сваёй культурай, — заяўляе Юліянна Дораш. Караліна Ігнацюк і Ганна Мордань — таксама акцёры „Антракта”.

— Заўважыў я, што наша моладзь бачыць вартасць свайго рэгіёна і любіць урокі аб мінулым і сваёй культуры. Вучні цікавяцца беларускімі мерапрыемствамі і прымаюць удзел у іх. Штораз больш нашых вучняў пачынае таксама глыбей цікавіцца праваслаўем і гэты працэс невымушаны. На нашу моладзь вялікае ўздзеянне мае Дарафей Фіёнік, да якога ахвотна ходзяць вучні. Бачаць яны, што апрача гарадскога гоману ёсць іншае жыццё і пачынаюць цікавіцца сваімі каранямі, — кажа дырэктар Васіль Ляшчынскі. — Вучні любяць спатыкацца з людзьмі, якія з’яўляюцца носьбітамі нашай культуры. Моладзь сустракалася з вясковымі жанчынамі, а апошнім часам мы ладзілі спатканне са Святланай Сычэўскай, дачкой нашага патрона Яраслава Кастыцэвіча.

Аляксей МАРОЗ

Вучні бельскай „тройкі” перамагалі ў Конкурсе беларускай песні, займаючы самыя лепшыя месцы. Гімназісты з калектыву „Капрыс” здабылі Гран-пры, вучні падставовай школы з гурту „Вясёлка” занялі першае месца ў катэгорыі школьнікаў IV-VI класаў, а дзеткі з калектыву „Журавінка” і іх салістка Паўліна Паўлючук занялі першыя месцы ў групе наймалодшых вучняў. Вучні дабіліся поспехаў таксама ў конкурсах па беларускай мове і іншых прадметах. Лаўрэатамі беларускамоўнага конкурсу сталі вучні падставовай школы: Оля Ігнацюк, Агнешка Рэпнік, Ева Шкода, Марлена Леанюк, Іванна Насковіч і гімназісты Ганна Мордань, Юліянна Дораш, Юліта Сахарчук, Наталля Ткачук. У Конкурсе праваслаўнай рэлігійнай паэзіі ў саставе пераможцаў былі: Матэвуш Магрук, Якуб Філіпюк і Кацярына Бабулевіч, якія дэкламавалі творы па-беларуску. З ліку многіх спартыўных поспехаў вучняў „тройкі” самы вялікі — першае месца каманды хлопцаў на Беластоцкай алімпіядзе школьнай моладзі па лёгкай атлетыцы.



Вінцук Вячорка і наша рэдакцыя

[1 ☞ працяг]

цяўляцца дапамога праваабарончым арганізацыям, а праз іх шматлікім ахвярам рэжыму, калі будуць гарантыі далейшага навучання студэнтам, якіх павыганялі або павыганяюць з вучобы, гэта, прабачце, не ёсць подкуп, гэта ёсць абсалютна нармальная, людская, дэмакратычная салідарнасць.

— А які ёсць сэнс у тых дзеяннях апазіцыйных галадовак маладых апазіцыянераў у Салігорску ці акты маўчання ў Брэсце? Рэжым, Лукашэнка заўжды можа сказаць: „А галадаюць, дык няхай сабе галадаюць!"

— На вялікі жаль, гэтакія рэжымы як лукашэнкаўскі ні ў грош не ставяць чалавечае жыццё і здароўе. І паводзіны гэтага рэжыму шматкроць гэтага даказалі. Адзінае толькі, што калі паднялася хваля ўсясветных пратэстаў пасля знікнення людзей, знікненні на пэўны момант прыпыніліся. Але затое ўсякія іншыя рэпрэсіі расцвілі — арышты, доўгатэрміновыя турэмныя пасадкі, штрафы, збіццё невядомымі людзьмі актывістаў дэмакратычнага руху... Маладыя людзі гэтым спосабам — праз галадоўку — хочуць прыцягнуць увагу і беларускай, і ўсясветнай супольнасці да вельмі небяспечнай крымінальнай справы. Яна прэцэдэнтная. Калі ўзбуджаецца справа за тое, што ты гаворыш ад імя незарэгістраванай арганізацыі, дык заўтра і партыі могуць фармальна пазачыняць, і прафесійныя саюзы, і шматлікія няўрадавыя арганізацыі, якія не спыняць сваю дзейнасць. Так як не спынілі дагэтуль фармальна зачыненыя. І мы ўсе тады становімся крымінальнымі злачынцамі. Таму я паважаю іх гэты адважны крок, але з другога боку разумею, што трэба мець шырэйшы інструментар супраціву. Не толькі галадоўкі. Каб не было так, што Лукашэнка з гэтага толькі цешыцца.

— Ну вось, Лукашэнка пэўна цешыцца, калі чуе, што беларуская апазіцыя раз'яднаная. Як ёсць у сапраўднасці — яна ўз'яднаная, ці не?

— Мы цягам перадвыбарчай кампаніі дасягнулі максімальнай магчымай ступені адзінства. Ну, на жаль, увогуле немачыма аб'яднаць увогуле ўсіх. Тым больш усіх, хто супраць. Лягчэй аб'яднаць тых, хто за. Той жа сербскі прыклад паказвае, што яны калісьці як бы і ўсе аб'ядналіся; Вук Дражкавіч так і не аб'яднаўся з астатнімі дэмакратычнымі сіламі. У нас было нешта падобнае: сацыял-дэмакратычная партыя Аляксандра Казуліна не пажадала ўвайсці ў агульны блок, і я думаю, што гэта здарылася з-за розніцы стратэгій. Мы рабілі ўсё што ў нашых сілах, каб перамагаць, нягледзячы на вельмі кароткі тэрмін, таму і змаглі змабілізаваць людзей, а ён хіба думаў як застацца ў палітыцы. Дарэчы, наш святы абавязак цяпер вызваліць і Казуліна, і іншых палітычных вязняў з турмы, а ўжо потым весці перамовы з імі пра аб'яднанне, каардынацыю і так далей. Унутры нашай кааліцыі цяпер ідуць дыскусіі, адзін бок прадстаўляе Анатоль Лябедзька, другі ўсе астатнія. Анатоль Лябедзька лічыць, што трэба правесці паўторны кангрэс. Мы, і Народны Фронт, і Мілінкевіч, і ўсе іншыя суб'екты аб'яднаных дэмакратычных сіл, перакананыя, што не трэба кангрэсу, а трэба далей выконваць мандат папярэдняга кангрэсу, змагацца за як найранейшыя датэрміновыя дэмакратычныя выбары. Калі мы цяпер зоймемся кангрэсам, перастанем ездзіць па рэгіёнах, перастанем рыхтаваць спецыяльныя ўлёткі і звароты для рабочых бюджэтаўтваральных прадпрыемстваў, да моладзі, то мы збавім тэмп і Лукашэнка зноў пяройме ініцыятыву.

— У чым могуць памагчы беларуская меншасць у Польшчы, Польшча і Еўрасаюз на гэтым этапе апазіцыйных дзеянняў?

— Што да беларускай грамады ў Польшчы — перадусім сваім прыкладам рэалізацыі правоў, у тым нацыянальна-культурных правоў у дэмакратычнай дзяржаве, гэта значыць наяўнасцю і развіццём усіх адукацыйных, культурных, палітычных інстытутаў. Гэта магло б служыць моцным аргументам для нас: дэмакратыя ёсць добрая для нацыянальна-культурнай перспектывы беларускага народа ці беларускіх меншыняў. Вельмі важна, што беларусы Польшчы актыўна ўдзельнічаюць у свабодных, непадкантрольных Лукашэнку масмедыях. Маю на думцы Радыё Рацыя; дарэчы, газета „Ніва", якая даходзіць у Беларусь, якая чытаецца на сайце, ёсць таксама адным з такіх каналаў данясення праўдзівай, аб'ектыўнай інфармацыі і дае магчымасць рабіць свае высновы. Польшча, як краіна, як і сусед, штосьці робіць у галіне падтрымкі альтэрнатыўных сродкаў інфармацыі — гэта і радыё, і перспектыва тэлебачання; мы гэта выдатна вітаем, гэта высока цэніцца. Польшча на еўрасаюзнай трыбуне, разумеючы, што такое таталітарызм, посттаталітарызм, небяспека імперыялізму, каштоўнасць незалежнасці, уздымае беларускае пытанне, правільна разумеючы нашыя сапраўдныя праблемы, трывогі. У прыватнасці тое, каб наша дарога да дэмакратыі не паставіла пад пагрозу нашу незалежнасць. Бо такія спадзевы ў палітыкаў так званай старой Еўропы — я не люблю гэтага азначэння, я ўжываю яго асобна, — яны былі. Што трэба дамаўляцца з Расіяй, каб Расія дапамагла дэмакратызацыі ў Беларусі. Каб яна не перашкаджала, — гэта было б ужо дастаткова.

— Чаго чакае беларуская апазіцыя пасля саміту Г-8 у Санкт-Пецярбургу?

— Мы разумеем, што тое, што мы зрабілі самі сваімі рукамі на беларускай зямлі, гэта наша. Ніякія дзядзькі ў ніякіх іншых сталіцах усё роўна за нас нашу работу не зробяць. Але — калі на васьмёрцы перад Расіяй дэмакратычныя краіны еўраатлантычнай супольнасці паставяць жорстка пытанне пра Беларусь, пра тое, што нельга падтрымліваць антыдэмакратычны рэжым Лукашэнкі, і нельга стварыўшы такую залежнасць лукашэнкаўскай Беларусі ад Расіі ставіць пад пагрозу наш дзяржаўны суверэнітэт, то ўжо само па сабе будзе вельмі моцнае. Я ведаю, што на Г-8 павінны прагучаць канкрэтныя рэчы: вызваленне палітычных вязняў, стварэнне вольнай інфармацыйнай прасторы і правядзенне свабодных празрыстых дэмакратычных выбараў, якія былі б прызнаныя дэмакратычным светам.

— Але ці ёсць надзея, што гэта збудзецца?

— Наколькі я разумею, як Злучаныя Штаты, так і еўрапейцы, такія пытанні збіраюцца падымаць, хоць безумоўна сітуацыя складаная, бо Расія фармальна гаспадар васьмёркі, і ейны статус як гаспадара, на жаль, трошкі вышэйшы, чым калі б была яна кудысьці проста запрошаная. Баюся, што гэта можа кагосьці ўсцерагчы перад вострымі заявамі. Усякія эканамічныя фактары, паўночны еўрапейскі газаправод і так далей, і часам, на жаль, прагматычны матэрыяльны бок вымушае людзей забывацца на такія справы.

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Не мела баба клопату...

Задумаў я пакарыстацца паслугамі лічбавага Польсату. Заахвоціла мяне да гэтага рэкламная лістоўка. Фірма прапанавала прамоцыю: дэкодэр за 199 зл. ды месячны абанемент за фамілійны пакет — 29,90 зл. На адваротнай старонцы лістоўкі была прыпіска, што прамоцыя сапраўдная тады, калі дадаткова выкупіш пакет „Рэлякс-Мікс" за 19,90 зл. Кліент у такім выпадку абавязаны будзе плаціць не 29,90 зл., але 49,80 зл. Гэтага я не заўважыў, паколькі не чытаў зместу дамовы перад яе падпісаннем.

За першы месяц я не плаціў абанементу, бо так запісана ў прамацыйным дагаворы, а за наступныя штомесячна пералічваў па 40,90 зл., г.зн. 35 зл. за фамілійны пакет ды дадатковы — „Фільм" — 5,90 зл. — адпаведна ўстаноўленым фірмай стаўкам.

Праблемы пачаліся ў канцы лютага, калі ўпершыню адключылі мне тэлеканалы пакета „Рэлякс-Мікс". З гэтым я не мог пагадзіцца, паколькі лічыў, што заплаціў абанемент наперад. Першую рэкламацыю ў цэнтр абслугі кліента паслаў я 2 сакавіка. Не атрымаў адказу. Пасля фірма гуляла са мною ў жмуркі: раз пастаўляла сігнал на тэлеканалы „Рэлякс-Мікс", то зноў выключала. Чарговую рэкламацыю паслаў я ўжо на адрас дырэктара цэнтра абслугі кліента праз месяц — 3 красавіка. Не адказалі. 4 мая адключылі сігнал. Восем разоў я тэлефанаваў, каб высветліць справу. Надарэмна траціў грошы, бо заўсёды паўтаралі: „Незаплачаны абанемент". А калі 19 мая ў час апошняй размовы даказаў я, што без прычыны адключылі сігнал для дэкодэра, дык мой суразмоўца падаўся назад і заявіў, што яны нічога не адключалі, затым я павінен аглядаць усе тэлеканалы фамілійнага пакета. Адным словам, зрабілі мяне ілгуном.

Праўда, я зрабіў памылку, калі падпісваў дамову (абавязаны быў тады адмовіцца ад карыстання пакетам „Рэлякс-Мікс"), але яе выправіў. Польсат не адчувае сябе вінаватым, хоць бярэ грошы, але не аказвае паслугі.

Па-мойму, так вядомая фірма на медыяльным рынку павінна дбаць аб сваю рэпутацыю, шанаваць закон, у якім запісана, што справа рэкламацыі мае быць разгледжана на працягу месяца і дадзены адказ прасіцелю. Аднак нягледзячы на мае пісьмовыя скаргі, лічбавы Польсат надалей рассылае свае рэкламныя лістоўкі, якія заахвочваюць купляць пакет „Рэлякс-Мікс". У апошнім пісьме дырэктару цэнтра абслугі кліента я рашуча адмовіўся ад далейшага супрацоўніцтва з фірмай, бо заключэнне дагавора з Польсатам лічу няўдалай здзелкай і хачу перасцерагчы іншых. Не дазвольце звесціся прамоцыям гэтай фірмы. Прыпомнілася мне ў гэтай катавасіі адна мудрасць: „Не мела баба клопату..." Так у мяне з Польсатам атрымалася!

Уладзімір СІДАРУК

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 28 -

У гэтым годзе школа не будзе яшчэ да канца школьнага года прапанаваць кнігі для наступнага класа. Не, усе даведаюцца, якія кнігі патрэбныя будуць для кожнага вучня — і падручнікі, і практыкаванні, бо цяпер столькі гэтых розных аўтарскіх падручнікаў друкуецца ва ўсёй краіне, што настаўнікі выбіраюць, на іх думку, найлепшыя, і бывае, што нават у паралельных класах у адной школе вучні вучацца па розных кніжках. Можна купіць падручнікі ад вучняў старэйшых класаў, за меншую цану, і калі пашчасціцца, можаш ад акуратнага старшакласніка набыць вельмі дагледжаныя кніжкі, ну, зусім як новыя. Раней можна было купіць таксама навюсенькі камплект ад настаўніка, якому прысылала кнігі выдавецтва. І хоць гэта танней, чым у кнігарні, усё адно тата з мамай мусілі адкласці пару хрусткіх соцень на веды для свайго пестунка...

— Прэм'ер абяцяў таннейшыя кнігі! — прыпомніла бабуля, корпаючыся ў сваім кашальку; мабыць, трэба будзе дакласці да кніг унучцы.

— Мала што абяцяў прэм'ер! — злосна буркнула Гражынка. — Абяцаў нам таксама скарачэнне школьнага года.

— Усе яны абяцаюць перад выбарамі! — Грак ужо не першы раз чуў такое выказванне хатніх выбаршчыкаў.

— Пакуль я дарасту да часу, каб прымаць удзел у выбарах, дык іхныя ўлады шэсць разоў пераменяцца, злева направа, справа налева, і цэнтральна, як хочаш, — Гражынка пераглядала свае кніжкі, якія варта будзе запрапанаваць маладзейшым калегам. — А колькі можна ўзяць за стары падручнік па матэматыцы? Летась я пераборшчыла, чысцюткую „матму" прадала адно за тры злоты...

— Прынясі спісак кніг, буду шукаць у кнігарні летам таго, чаго не купіш, — мама зноў заглянула ў кашалёк, дзе ўжо купкі банкнотаў пазвівала ў пакецікі: на тое, на гэта...

— А, можа, усе кнігі ў суботу купіш ад старшакласнікаў? — Грак, хоць больш прыемна было яму крадком усе канікулы гартаць ды перачытваць новенькія кнігі, спалохаўся, што мама набудзе іх перад самым пачаткам новага школьнага года. — А потым толькі свежыя практыкаванні?

— Я цябе добра ведаю, Грачыска! — Гражынка ўжо рассакрэціла Гракову хітрую практыку. — А потым увесь год будзеш хваліцца, што лепш ведаеш ад мяне ўсю школьную праграму!

Міра ЛУКША

Дзяўчаты з Арэшкава



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Польска-беларуская крыжаванка № 25



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 21: Чарот, фрак, крок, флот, нара, мікрафон, гара, так, армія, сем, Орша, ідал. На, аса, гар, марш, фірма, толк, Орля, фота, фонд, акно, кран, не, вока, сум.

Узнагароды, пісьмовыя наборы, выйгралі: **Сільвія Снарская**, **Агата Паніквіцкая** з Бабік, **Наталля Сцепанюк** з Беластока. Віншуем!

Вершы Віктара Шведа

КУРЫЦА ЖУРЫЦЦА

Курка ўкрала лот пшаніцы.
Пачалі з ёю судзіцца,
Адчыталі параграф,
Засудзілі плаціць штраф.

Курка грошыкаў не мае,
Знесла толькі пару яек.
— Як жа я вам дагаджу?
Замест платы — пасяджу.

ТОЛЬКІ ВА ЎЛАСНАЙ АБАРОНЕ

Знервавалася надта матка,
ды настаўніку ліст піша:
— Прашу не пакараць дзіцятка,
Слабы, спакойненькі наш Міша.

Рукам не можна даваць волю,
У школе гэта ў забароне.
Сынка свайго не б'ем ніколі,
Хіба што ва ўласнай абароне.

РАЗАМ З ВАМІ ВЕСЯЛЕЙ!

Хмурнае надвор'е палохала з самага рання, але 5 чэрвеня ў Арэшкаве панаваў гарачы настрой. Калі на сцэну, якая ў сапраўднасці была пляцоўкай упрыгожанай бярозкамі, выйшаў дынамічны гурт „Зорка" з Беластока — школьны пляц проста завіраваў! У танцы пайшлі і малыя, і старыя. А ды-джэй і заадно саліст Янка яшчэ мацней намаўляў да скокаў:

— *А цяпер „Чорны очка!" — усе бярэмся за рукі і до кулэчка!*

— Гэта ж наш вучань, — дырэктар Гражына Бэрэзняк хваліць свайго выхаванца-музыканта. Праўда, Янка хадзіў у Махнатае. Зараз там закрытая школа, а частка настаўнікаў перайшла ў Арэшкава — адтуль і знаёмасць.

У Арэшкаве ёсць нагода для танцаў — школа будзе існаваць далей. У ёй 43 вучні, з верасня ў нулявы клас прыйдзе дзесяць дзетак.

* * *

Цягам апошніх гадоў у школах сталі звяртаць увагу на сямейныя каштоўнасці. Школьны фэст у Арэшкаве быў праведзены ў рамках праграмы „Падляшскія дні сям'і". Тут спалучылі ў адно свята і Дзень маці, і Дзень дзіцяці, а нават красавіцкую акцыю супрацьдзеяння алкагалізму і наркаманіі. „Разам з вамі вясялей" — так ахрысцілі сваё свята ў Арэшкаве. Гэта паклон не толькі ў бок бацькоў, але і гасцей. У школу завітаў беларускі паэт Віктар Швед.

— Я надрукаваў 2,5 тысячы вершаў у „Ніве", — сказаў у час сваёй прэзентацыі паэт. За гэта атрымаў ён бурныя апладысменты.

— Дзякуючы вам беларуская мова яшчэ існуе, — дзякавала пазней паэту войт Гайнаўскай гміны Вольга Рыгаровіч.

Віктара Шведа сустрэлі ў Арэшкаве з пашанай і цікавасцю. Калі паэт, родам з недалёкага Мора, хацеў скараціць сваё выступленне, публіка пратэставала:

— Нам цікава! Гаварыце яшчэ, нам цікава!

Выступленне Віктара Шведа папярэдзілі мастацкія выступленні. Школьныя дэкламатары падрыхтавалі падборку вершаў паэта, музычны гурт „Незабудка" праспяваў беларускія песні. Былі, вядома, і пастаноўкі, дзяўчаты падрыхтавалі „Галерэю славутых жанчын". Спісак славутасцей адкрывала занесеная ў лік святых каралева Ядвіга, а закрывала лаўрэатка Нобелеўскай прэміі, паэтэса Віслава Шымборская.

Арганізатары памяталі пра мясцовых самадзейнікаў. Гасцямі школы былі жанчыны з этнагурту „Арэшкі". Яны таксама праспявалі песні пра матуль. Пасля іх выступлення на небе паказалася сонейка.

— А ў мяне тут унучка ў першым класе, — кажа Надзея Грушэўская, кіраўнічка хору.

* * *

— У нас практычна ўсе ходзяць на беларускую мову, — кажа Ірэна Герасімюк. Навучанне пачынаецца з другога класа. Амаль сто працэнтаў прыступае да школьнага конкурсу „Роднае слова". Эвеліна Дунда заквалі-фікавалася на цэнтральны этап і паехала ў Нараўку, а Магда Галёнка прымала ўдзел у прадметным конкурсе беларускай мовы і стала фіналісткай.

Славу школе заваёўвае таксама музычны гурт „Незабудка", які вядзе матушка Беата Маркевіч. Вось і заўтра нашы сябры збіраюцца на экскурсію ў Яблачын і Люблін. Там выступяць у люблінскім Доме для састарэлых і атрымаюць начлег. Экскурсію, спалучаную з паломніцтвам, арганізоўвае айцец Лявон Анхім. Дзякуючы яго старанням кошт паездкі атрымаўся сімвалічны.

— Супрацоўнічаем таксама з БГКТ, — адзначае пані Гражына Бэрэзняк. — Яны зафундавалі на сённяшняе свята дыскапольны калектыў „Зорка" (музыканты запіраліся, што ўпершыню чуюць пра нашу газету!).

Прыехалі таксама спонсары з Гайнаўкі. Пякарня Падальшынскіх з Гайнаўкі зафундавала смачныя пірагі і хлеб, а Малочны кааператыў — жоўты і белы сыры. Пастараліся і настаўніцы з бацькамі. Кожны, хто прыйшоў на свята школы, еў і гуляў у вясёлай кампаніі.

А за аўтографам Віктара Шведа выстраілася чарга. Кніжкі паэта купіў кожны чацвёрты вучань.

ЗОРКА
Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Мацнее студзіводскі фестываль

III Міжнародны фестываль веснавога фальклору „Там по маёвуй росі", які з 29 мая па 4 чэрвеня праходзіў у Музеі малой айчыны ў Студзіводах, паказаў новыя якасці народнай творчасці. Першы раз выступіў калектыў з Усходняга Падляшша, а менавіта з Камянецкай зямлі. Жанчыны з вёсак Лісоўчыцы і Вайская, якім даезд на мерапрыемства разам з перасячэннем мяжы занялі толькі некалькі гадзін, паказалі традыцыйны спеў, народныя танцы і вясельную абраднасць, якія папоўнілі вельмі багатую прэзентацыю мясцовага фальклору Бельшчыны і Гайнаўшчыны. Своеасабліва гучалі народныя песні ў выкананні моладзі і беларускія творы ў інтэрпрэтацыі дашкольнікаў, якія цёпла ўспрымала публіка.

— Веснавыя песні гэта аснова фальклору, але мы выходзім шырэй і кожны год адкрываем новае ў народнай творчасці. Усе нашы фестывалі адметныя і непаўторныя. У гэтым годзе мы звярнулі ўвагу на народныя танцы і больш, чым у мінулых гадах, месца адвялі традыцыйнай інструментальнай музыцы, — заяўляе Дарафей Фіёнік, ініцыятар і галоўны арганізатар мерапрыемства, якое з кожным годам здабывае новых прыхільнікаў і гледачоў. У гэтым годзе з песняй на сваёй нацыянальнай мове выступіў негр з Буркіна-Фасо — краіны ў Заходняй Афрыцы, які выпадкова трапіў на студзіводскі фестываль.

Яшчэ да афіцыйнага адкрыцця фестывалю на музейным панадворку ў Студзіводах стварыўся непаўторны клімат. У час варштатаў, якія з 29 мая вялі Сяргей Аленкін з Рыгі, Вольга Кандратовіч з Падбелля, Аляксандра Куптэль і Кацярына Ціханюк са Збуча, маладыя людзі з Бельска, Беластока ці Варшавы вучыліся спяваць народныя падляшскія песні і танцаваць пад гукі традыцыйных музычных інструментаў.

— Удзельнікі варштатаў паспяхова знаёміліся з народнымі танцамі і спевамі. Здаралася, што сустрэчы працягваліся па-за прызначаныя для абучэння гадзіны, бо была ахвота пагуляць, — кажа Аня Фіёнік, якая пасля выступіць на сцэне разам з іншымі маладымі выканаўцамі з песнямі і танцамі. З народным спевам гасцей з Беларусі і калектыву „Ільінская пятніца" мелі нагоду пазнаёміцца бельскія белліцэісты. Некаторым вучням вельмі спадабаліся даўнія песні, вынікам чаго было наведванне імі фестывальных мерапрыемстваў.

„Ільінская пятніца" з Рыгі 2 чэрвеня (20 мая паводле юліянскага календара, якім карыстаюцца таксама арганізатары мерапрыемства) заслужана адкрыла фестываль, з якім яна супрацоўнічае ад самага пачатку. Пазней гэты калектыў — ужо як зорка фестывалю — вельмі ўдала прэзентаваў падборку падляшскага фальклору. Дарафей Фіёнік заўважыў, што на мерапрыемства запрашаюцца замежныя калектывы, каб расслаўлялі традыцыйныя песні беларусаў у свеце. Песню „Там по маёвуй росі" ў выкананні спевакоў з Рыгі публіка ўспрыняла з радасцю, а дзеткі з Самаўрадавага прадшколля н-р 7 у Бельску-Падляшскім, у якім рэалізуецца праграма па беларускай культуры, моцна ўзрушылі сабраных, спяваючы песні з патрыятычным ухілам. Яны своеасабліва гучалі з вуснаў дзетак, якія толькі вучацца правільна вымаўляць словы. Дзеткі з Рыбалаў спявалі народныя песні і цікава паказаліся са старымі танцамі. Жанчыны з вёсак Лісоўчыцы і Вайская выступілі з народным танцам „Падыспан" і песнямі сваіх сёлаў. Заўважваліся падабенствы ў песнях, якія спяваліся на нашых вясковых лавачках, і адначасна большае ўздзеянне на іх усходняй культуры.

Карагод з веснавымі песнямі састаўлялі калектывы і публіка (справа Дарафей Фіёнік)

— Мы спяваем яшчэ на вяселлях і хрысцінах. У нашым рэпертуары старадаўнія песні, сярод якіх апрача веснавых твораў ёсць песні прымеркаваныя да іншых пор года і рэлігійных святаў, — кажуць Люба Нічыпарук з Лісоўчыц і кіраўнік калектыву Люба Міхновец ды прапануюць паразмаўляць з лісоўчыцкай жанчынай, якая мае сваякоў у Арэшкаве.

Жанчыны з Лісоўчыц і Вайской выступілі з народнымі песнямі і танцамі

— Раней я ў калгасе даіла па 30 кароў і не было часу на спевы. Зараз я на пенсіі і выступаю з калектывам. Бывае, што чакаючы хлеба, мы заходзім у дом сацыяльнай дапамогі і там станцуем нешта або заспяваем, — гаворыць Ганна Вялічка, якая ва ўспамінах вяртаецца ў часы, калі Гайнаўшчыну і Камянеччыну не раздзяляла мяжа. Тады сястра яе бабулі выйшла замуж у Арэшкава, дзе і зараз жывуць сваякі маёй субяседніцы.

У Студзіводах выступіў таксама гурт „Дубіны", якім апякуецца Пётр Скепка (спяваў ён з моладдзю і іграў на акардэоне). Моладзь з Дубін карыстаецца даўнімі музычнымі інструментамі, што робіць іх выступы больш цікавымі. Гурт „Антракт" з Бельскага дома культуры ўдала выступіў з пастаноўкай „Рэкруты" (матывы рэкрутчыны яшчэ паўтараліся ў многіх песнях). Дарафей Фіёнік паясніў, што прызыў маладых хлопцаў у рэкруты адбываўся вясной і таму рэкрутчына паяўляецца ў веснавым фальклоры.

— Калісь жанчыны, выходзячы з царквы на Святую Тройцу, рвалі кляновыя лісткі і хадзілі з імі па вёсцы, спяваючы веснавыя песні. Гэтая старая традыцыя захоўваецца яшчэ ў некаторых рэгіёнах Беларусі, — заяўляе Дарафей Фіёнік і запрашае сабраных прыняць удзел у супольным шэсці па вуліцах Студзіводаў, якому будуць спадарожнічаць даўнія веснавыя песні і танцы.

Да сабраных выходзіць дзяўчына прыгожа прыаздоблена кляновымі лісткамі і разам з іншымі маладымі дзяўчатамі праходзіць сярод публікі. Сабраныя хутка падымаюцца і, стварыўшы вялікі карагод, ходзяць па вузкіх вулічках Студзіводаў, спяваючы каля паасобных хатаў веснавыя песні. Гаспадары, якія ўжо ў мінулых гадах пазнаёміліся з забытай традыцыяй, шчодра абдорваюць веснавых „каляднікоў". Пасля сабраныя затрымліваюцца каля вясковых крыжоў і на адкрытай плошчы ладзяць карагодны танец. Некаторыя з сабраных упершыню на фестывалі і таму вучацца простым крокам, якія трэба ставіць, каб карагод кружыўся.

— Нашай мэтай не з'яўляецца пераўтварэнне нашага фестывалю ў масавае мерапрыемства, толькі вынясенне на п'едэстал нашай народнай культуры. Бачым, што многія калектывы, рыхтуючы рэпертуар на нашу сустрэчу, вышукваюць забытыя песні, якія можна будзе захаваць, — кажа Дарафей Фіёнік. — У час фестывалю ёсць нагода многаму навучыцца ў іншых спевакоў, а пасля яго заканчэння атрымаць мабілізацыю да працы на ўвесь наступны год.

Вучоба народным танцам працягваецца пазней пад акампанемент калектыву з Лісоўчыц, які прыехаў дзякуючы заслужанаму супрацоўніку фестывалю Ірыне Мазюк з Мінска.

Старэйшая публіка на наступны дзень збіраецца на канцэрт, на якім выступяць калектывы і салісты з Бельшчыны і Гайнаўшчыны, госці з Беларусі, Рыгі і маладзёжны калектыў „Жэмэрва" з Музея малой айчыны ў Студзіводах, якога выступленні заўсёды выклікаюць вялікае зацікаўленне як вясковай, так і гарадской публікі. У час мерапрыемства запісваюцца цікавыя народныя песні ў выкананні жанчын з Чаромхі, Збуча, Крыўца ці спевакоў з Чыжоў, Дубін, Кожына, Плёсак або Вулькі-Тэрахоўскай, якія можна будзе выкарыстаць у будучыні. Кампакт-дыскі з песнямі, якія можна было пачуць у мінулых гадах, прадаваліся ў час мерапрыемства і купляючы іх можна было стаць адным са шматлікіх спонсараў фестывалю. Актыўнымі ўдзельнікамі фестывалю былі скрыпач Пётр Юшкевіч са Збуча, якога віншавалі з 90-гадовым юбілеем і 94-гадовы гарманіст Юрый Грыгарук з Галадоў. Хаця канцэрт доўжыўся пад 5 гадзін, публіка не нудзілася, а наадварот, уключалася ў спяванне песень, якія гучалі са сцэны. Увагу сабраных прыцягнуў калектыў з Маліннік, які прыехаў на двух вазах, якімі пасля падвозілі іншых выканаўцаў. Коні і размаляваныя дугі выклікалі зацікаўленне не толькі дзетак.

Публіку састаўлялі старэйшыя і маладыя людзі

Яшчэ да суботняга канцэрта была магчымасць паглядзець абрад вяселля, які дэталёва паказалі жанчыны з Лісоўчыц і Вайской. Адбылася таксама прэзентацыя этнаграфічных дакументальных фільмаў. У апошні дзень фестывалю некаторыя яго ўдзельнікі выступілі на Гайнаўшчыне. Спявалі яны народныя песні і танцавалі ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы і Арэшкаве, разам з мясцовым калектывам „Арэшкі".

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Пачынаецца ўсё з ракі Нявежыс

(пачатак у 22 н-ры)

У старым парку, пад кельцкім крыжам у гонар бога раслін, у машыне аўтаматычна ўключыўся радыёпрыёмнік.

— Каб яшчэ сказалі каторая гадзіна, — кінула жартам Т.

Калі ласка! На радыё быццам і чакалі ейнага загаду:

— Трынаццаць гадзін, пятнаццаць хвілін, — паінфармаваў мілагучны голас.

Далей пайшла казка пра двух шляхетных хлопчыкаў, якія нібыта ў сне патрапілі да Вялікага Чарадзея. Сонная дзея адбывалася над берагам Чорнага мора, а чыталі яе на рускай мове.

У гэтым месцы трэба прызнацца да пэўнага занядбання. Чамусьці ў Літву мы рушылі як нейкія росхрысты, без гадзінніка. Ужо за Каўнасам Т. беспаспяхова шукала ў радыёпрыёмніку рускамоўнага канала. І вось, якраз у Шэтэйнах, быццам на прывітанне, выскачыла такая штуковіна.

Цяжка сказаць якія сілы спрацавалі на эфект. На ўсякі выпадак я пайшла за прыкладам падляшука Толіка і згаварыла малітву. Сам Чэслаў Мілаш лічыў, што асаблівасцю даліны Ісы з'яўляецца большая чым дзе-небудзь колькасць д'яблаў.

* * *

Чэслаў Мілаш нарадзіўся ў Шэтэйнах 30 чэрвеня 1911 года. Тут правёў першыя два гады, каб праз пяць гадоў вярнуцца і напрыканцы вайны назіраць за нараджэннем літоўскай дзяржавы. Развітанне з двaром бачым у „Даліне Ісы", калі разам з маці дзевяцігадовы Тамаш (літаратурны *alter ego* паэта) з'язджае ў 1920 годзе ў Вільню. Карціна захапляе паэтычнасцю. Будучы лаўрэат Нобелеўскай прэміі адправіцца ў свет на фурманцы з цыганскай будай, а лейцы ў рукі возьме ягоная маці ў квяцістай хустцы.

У 1999 годзе на месцы дварскога свірана літоўцы ўзвялі новы будынак. Зараз у ім знаходзіцца Культурны цэнтр імя Чэслава Мілаша.

— Прыязджайце да нас за два тыдні, — запрашае нас інжынерка Рома, — канферэнцыя будзе. Рома — валанцёрка, якую адарвем ад сямейнага абеду ў вёсачцы Шэтэйны.

— І ўдзень, і ўвечары адкрываю дзверы паклоннікам паэта, — кажа. Хоць з наведвальнікамі — праблема. Рома мае на ўвазе сваіх суродзічаў — літоўцаў.

— Чамусьці ў нас абыякава ўспрымаюць яго творчасць, — пры апошніх словах у Ромы румяняцца шчокі. (Чэслаў Мілаш як мала хто цаніў жаночую інтэлігенцыю і інтуіцыю!).

— А якія творы перакладзеныя на літоўскую мову?

— Ну, усе — здзіўляецца пытанням сімпатычная літоўка.

* * *

Яшчэ да сустрэчы з Ромай мы абышлі туды і назад дварскі парк. На развітанне з радзімай Тамаш з „Даліны Ісы" меў пасадзіць свой каштан. Між галінамі старых ясеняў, ліп і клёнаў, якія памятаюць дзяцінства паэта, дзьмуў буйны вецер. Хоць вандраваць з „галавой у хмарах" было тут небяспечна, пад нагамі з'яўляліся таемныя ямы ад дварскіх будынкаў або ваенных бамбардзіровак. Чуткасць у нагах аплацілася ў два разы. Мы наткнуліся на пластмасавыя буталі, падчэпленыя да старых клёнаў. З дрэў сцякаў мутна-салодкі сок. Наколькі законным уласнікам парку далей астаецца Чэслаў Мілаш, мы пайшлі за голасам інтуіцыі і пачаставаліся вясновым напоем. Пасля хацелася прылегчы на свежай траўіцы, з белымі і фіялетавымі фіялкамі ды пралескамі. Паветра, здавалася, дрыжыць ад салодкіх жаўранкавых трэляў.

— О, яшчарка! — Т. падхапіла на руку гадзюку.

Многія нячысцікі, як вераць аўтахтоны ў „Даліне Ісы", ператвараюцца ў гадзюк, яшчэ іншыя з'яўляюцца ў выглядзе нямецкіх элегантаў: у зялёным фраку і белых панчохах, ды туфлях на высокіх абцасах, рыхтык сам Імануіл Кант з Каралеўца.

Следам гадзюк і паўзуноў — у бок ракі, на час вясновых вяселляў, спяшаліся мажныя рапухі. Мы таксама рушылі да берагоў Нявежыса. Даліна прыхаваная ад свету і хоць яна шырокая на пяць кіламетраў, амаль яе не відаць з галоўнай дарогі, што ідзе манатоннай раўнінай. Тут усё наадварот, хопіць падысці ў бок Свябросці (Sventybrastis), каб адчуць сябе як на ўзгорыстай Сувальшчыне. Тут менавіта ўнізе мог натхнуцца Тадэвуш Канвіцкі, падбіраючы сувальскія кадры для фільма „Даліна Ісы". Такая перспектыва відавочная толькі з сярэдзіны, і на згаданым адрэзку. У канцы адрэзка патрапім пад стары касцёл з могільнікам і дубовым гаем. Тут, як адзначаў сам паэт, знаходзілася капішча ў гонар агню. Праз раку ідзе брод, тут заўсёды ў сярэдзіне ракі спыняўся конь, каб напіцца вады. Даліну дадаткова аддзяляюць высокія насыпы, якія ў народзе завуць Шведскімі валамі. Каб глядзець на дварскі парк і вёску Шэтэйны (шэсць хатак), трэба задзіраць галаву.

Над вадой, быццам у час дзяцінства паэта, выседжвалі рыбакі з вудкамі. Пахла свежай рыбай.

Фота ТЭРЭЗЫ СВЯРУБСКАЙ

Культурны цэнтр у Шэтэйнах

Фота ТЭРЭЗЫ СВЯРУБСКАЙ

Аўтарка з валанцёркай Ромай

* * *

Названая на пачатку мэта падарожжа: *каб папіць кавы ў манаўскай Нерынзе!* слушна выклікае падазрэнні. У сапраўднасці гэта сакрэтны код, апрацаваны ў час нядзейсненага падарожжа ў Крым. Выклікала яго простае і шчырае пытанне, накіраванае пад уласны адрас. Сапраўды — навошта ехаць у модны Крым або Нерынгу ў час турыстычнага буму? Каб не застрэліць сяброў банальшчынай, трэба было прыдумаць тэкст, пасля якога далей цябе ўжо не цягнуць за язык, адно зайздросцяць. Такі адказ наляцеў сам на хаду: як навошта? Глянуць на Чорае мора, прашпацыравацца па славутым тратуары, выпіць каву і ў той самы дзень з'ехаць у хату. Слова *кава* ідэальнае для пустых гутарак, яно мяняецца ў ваду, значыць у *акву*, дзякуючы якой можна загаварыць зубы самаму выдатнаму снобу.

Але ў гэты раз нам рэальна захацелася папіць кавы. Дзеля згаданай роскашы Т. узяла з сабой турыстычную газавую плітку. На месцы справа ўскладнілася, аказалася што ў нас няма запалак. Цягам першых дзесяці хвілін мы перавярнулі ўсе манаткі і закамаркі ў машыне. Сваю сумку, у якой заўсёды нашу запальнічку, я ператрэсла разоў сто. Каля цэнтра не было жывой душы. Усе стэнды і інфармацыя былі на літоўскай мове (некаторыя на англійскай). Але мы не здаваліся. Пайшлі ў вёску да выбранай інтуітыўна хаты і парасілі запалак. Там мы сустрэлі валанцёрку Рому, якая, пабачыўшы нас, першая паднялася ад стала і заявіла:

— Буду праз трыццаць хвілін.

* * *

Дзякуючы Роме, мы патрапілі ў старую школу, над самым берагам Нявежыса. Будынак паставіў дзед паэта. Хоць радня Мілаша лічыла сябе палякамі, заняткі ў школе вяліся на літоўскай мове. Пра будынак таксама ўпамінаецца ў „Даліне Ісы".

Літаратурнага каштана мы не знайшлі. Затое адшукалі маленькі дубок, пасаджаны рукой паэта. Чэслаў Мілаш прыязджаў у Шэтэйны чатыры разы пасля 1989 года. Хоць двор Кунатаў расцягнулі ў пачатку пяцідзесятых гадоў і ад дварскіх будынкаў асталіся шчарбатыя падвалы, паэт атрымаў ад літоўскай дзяржавы 16 гектараў зямлі з паркам. На горцы ў будынку Цэнтра гаспадару падрыхтавалі кватэрку. Пра вяртанні Чэслава Мілаша жыва апавядаюць фатаграфіі, якімі аздобленыя сцены Культурнага цэнтра.

— Мілаш у нас быў і яму падабалася, — скажа пасля нам Рома.

Дуб Чэслава Мілаша расце сярод дрэўцаў, пасаджаных рукамі славутасцей. У галерэі пра гэта інфармуюць таблічкі, на якіх прозвішчы і навукоўцаў, і мастакаў, і палітыкаў. Дрэва гаспадара пазначанае сякерай. Быццам хтосьці хацеў высечы дубок... і апамятаўся?

Мы развіталіся з Ромай і ўсё не маглі паверыць у цудоўнасць знаёмства. Калі ў час ад'езду я адкрыла сваю сумку, у рукі, замест жаданай аўтаручкі, папалася загубленая запальнічка.

Ганна КАНДРАЦЮК

Першая палова 90-х гадоў мінулага стагоддзя была адзначана з'яўленнем не зусім традыцыйных для Беларусі рэлігій. Тады і прыйшла на беларускую тэрыторыю вера Бахаі...

ВЕРА БАХАІ НА БЕЛАРУСІ

http://www.bahai.by

The Bahá'í Faith

Аўтэнтычнае беларускае насельніцтва заўсёды характарызавалася талерантнасцю да іншаземцаў і іх рэлігій. Таму праз часы існавання калыскі беларускай дзяржаўнасці — Вялікага княства Літоўскага, у ім мірна жылі і маліліся ў сваіх цэрквах рускія праваслаўныя стараверы, татары-мусульмане і свае беларусы, перайшоўшыя ў пратэстанцкія канфесіі, хаця асноўнай заставалася праваслаўная вера. Пазней, аднак, такога лагоднага стаўлення да рэлігіі ад трымаючых уладу на гэтай тэрыторыі не было — аб'яднанне з Каронай Польскай пацягнула за сабой акаталічванне, якое далёка не заўсёды адбывалася па закліку сэрца. Цяперашнія беларускія ўлады, якіх, як дрыгва, засмактала савецкая ментальнасць, таксама не могуць пагадзіцца з правам людзей маліцца Богу згодна сваіх меркаванняў. Ганенні на пратэстантаў таму пацвярджэнне. Але, тым не менш, сусветнае рэлігійнае шматкультур'е прарастае ў беларускай глебе і знаходзіць сабе месца пад сонцам, нягледзячы на закрываючыя яго хмары «праваслаўнага атэізму».

Першая палова 90-х гадоў мінулага стагоддзя была адзначана з'яўленнем не зусім традыцыйных для Беларусі рэлігій. Тады і прыйшла на беларускую тэрыторыю вера Бахаі. Цікавая яна тым, што першапачаткова ўзнікла ў XIX стагоддзі ў Іране, тагачаснай Персіі.

Калі мы зазірнем на сайт беларускіх бахаі, а месціцца ён па адрасе http://www.bahai.by, то зможам прачытаць аб гэтай веры многа цікавай, хоць і не бясспрэчнай інфармацыі. Галоўная старонка сустракае нас дыяграмамі, якія адлюстроўваюць колькасць бахаісцкіх суполак. Даволі арыгінальная прэзентацыя. Але, калі зважаць на моднае цяпер у беларускіх грамадска-палітычных колах і наваколлях згадванне колькаснай «вагі» арганізацыі, то такое заяўленне аб сабе становіцца цалкам зразумелым.

Значна цікавейшай падаецца старонка, якая носіць з сайтам аднолькавую назву «Вера Бахаі на Беларусі». Менавіта тут даецца магчымасць зразумець, што гэта за рэлігія. «Галоўны прынцып бахаі — адзінства, — падкрэсліваюць свае асаблівасці бахаісты. — І таму мы імкнемся да супрацоўніцтва з хрысціянамі, мусульманамі, іудзеямі ў нашай агульнай мэце — паляпшэння жыцця грамадства і духоўнага ўдасканалення кожнага асобнага чалавека. Мы прызнаем усе богаяўленыя рэлігіі, бо ўсе яны далучаюць чалавека да Бога і тым самым робяць ягонае жыццё па-сапраўднаму шчаслівым».

Старонка «Суполкі бахаі на Беларусі» распавядае пра тое, як прыйшла і распаўсюджвалася бахаісцкая вера ў Беларусі. Праўда, не зусім зразумелым ёсць выяўленне самалёта Аэрафлота з савецкай сімволікай, у які сядаюць людзі. Маюцца ў тэксце і гіперспасылкі на мінскую і віцебскую старонкі сайта. На іх ужо больш падрабязна распавядаецца аб жыцці, а таксама дзейнасці мясцовых бахаістаў на карысць мясцовага люду. Тут прыгадваюцца выставы карцін, творчыя майстэрні, велапрабегі, распаўсюджванне кніг па бібліятэках і многае іншае.

Акрамя запрашэння да далучэння да веры, бахаісты таксама прапануюць прыняць удзел у напісанні вершаў, а таксама размясціць малюнкі сваіх дзяцей на адпаведных старонках сайта.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларускі маюць вельмі высокія шанцы патрапіць у фінальную частку еўрафоруму. Аснову нашай зборнай складаюць валейбалісткі мінскай „Славянкі"...

Беларусь, беларусы...

З надзеяй на свае сцены

Валейбольная тэматыка рэдка з'яўляецца на старонках беларускага друку і тэлеэкранах. Нацыянальны валейбол, як і гандбол з баскетболам, перажывае цяжкія часы — катастрафічна бракуе інфраструктуры, грашовых сродкаў на ўтрыманне і развіццё клубных каманд, нацыянальных дружын рознага ўзросту, кепска аплачваецца цяжкая трэнерская праца. Гістарычныя ж поспехі нацыянальнага валейбола не такія важкія. Канешне, у мужчынскім валейболе былі беларусы — зоркі сусветнага маштабу — браты Аляксандр і Юры Сапегі, якія з вялікім поспехам выступалі за зборную СССР, маскоўскі ЦСКА, еўрапейскія клубы, але айчынныя каманды нічога істотнага не заваёўвалі. У дзяўчат дасягненняў было паболей. Жаночыя клубы з Мінска чатыры разы станавіліся бронзавымі прызёрамі чэмпіянатаў СССР („Спартак" у 1966, 1967 гг. і „Камунальнік" у 1986, 1987 гг.). А найбольшай вяршыняй была заваёва „Камунальнікам" Кубка ўладальнікаў кубкаў еўрапейскіх краін у 1987 годзе. У 2001 і 2002 гадах на першынстве кантынента сярод моладзевых дружын беларускія дзяўчаты заваявалі бронзавыя медалі.

Вынікі стартавага тура чарговага адборавага турніру да чэмпіянату Еўропы, які пройдзе ўвосень 2007 года, абнадзеілі. Беларуская мужчынская зборная пачала змаганне ў Партугаліі. У першы дзень падначаленыя Уладзіміра Салікава здолелі перамагчы бельгійцаў. Гэтая каманда была добра знаёмая беларусам, бо летась дружыны вялі спабор у кваліфікацыі да чэмпіянату свету. Тады верх упэўнена ўзялі нашы валейбалісты. Зараз поспех у цяжкім пяцісетавым паядынку зноў выпаў на долю Беларусі — 3:2 (25:19, 25:18, 16:25, 24:26, 16:14). Беларусы добра „запрэглі", але потым ледзь не „выпусцілі лейцаў". У наступнай гульні з гаспадарамі пляцоўкі партугальцамі нашы саступілі — 2:3 (22:25, 25:17, 25:18, 17:25, 13:15). А ў заключны дзень разграмілі відавочнага аўтсайдэра Азербайджан — 3:0 (25:22, 25:18, 25:14). Балазе беларусам дапамаглі бельгійцы, якія нечакана для ўсіх упэўнена адолелі партугальцаў — 3:0. Другі тур, які стане заключным, пройдзе 16-18 чэрвеня ў Мінску. У сваіх сценах беларусы маюць рэальныя шанцы на першае месца, а пакуль становішча прэтэндэнтаў наступнае: 1. Бельгія — 5 ачкоў (розніца сетаў 8-3), 2. Беларусь — 5 (8-5), 3. Партугалія — 5 (6:5), 4. Азербайджан — 3 (0-9).

Аналагічную кваліфікацыю беларускія валейбалісткі прайшлі без стратаў. У сталіцы Румыніі выхаванкі Уладзіміра Казлова паслядоўна перамаглі Боснію і Герцагавіну — 3:0 (25:17, 25:22, 25:11), Румынію — 3:1 (25:22, 22:25, 25:20, 25:21) і Харватыю — 3:2 (20:25, 25:21, 15:25, 29:27, 15:13). Такім чынам беларуская дружына стала лідэрам групы: 1. Беларусь — 6 пунктаў (9:3), 2. Харватыя — 5 (8:3), 3. Румынія — 4 (4:6), 4. Боснія і Герцагавіна — 3 (0:9). Другі, вырашальны тур, пройдзе 16-18 чэрвеня на пляцоўцы аўтсайдэра — Боснії. Беларускі маюць вельмі высокія шанцы патрапіць у фінальную частку еўрафоруму. Аснову нашай зборнай складаюць валейбалісткі мінскай „Славянкі", а галоўная бамбардырская моц — легіянерка Юлія Андрушка. Самае галоўнае — на бухарэсцкім туры беларускі „пераламалі" неаб'ектыўны арбітраж, які ўмеюць „арганізаваць" румыны. Значыць, у нашай каманды ёсць моцны характар.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Зайграй жа, дударочку...

Звычайна мы імкнёмся растлумачыць тую ці іншую культурную з'яву з пазіцыі наша жыццёвага вопыту. А паколькі часцяком гэты вопыт абмежаваны, то і нашы здагадкі выглядаюць даволі абмежаванымі. Прыкладам такой аднабаковасці можна лічыць адносіны многіх аматараў музыкі і журналістаў да такога неардынарнага музычнага інструмента, як беларуская дуда. Яго ні на што не падобныя зыкі і тэмбры магчыма пачуць у шматлікіх айчынных фолк- і рок-гуртах („Ліцьвіны", „Стары Ольса", „Znich"...)Ды вось з-за інертнасці новую з'яву (праўда, якая мае векавыя традыцыі) некаторыя імкнуцца вытлумачыць па-свойму: маўляў, вось і да нас прыйшла валынка!

На самой справе, дуда — інструмент ад пачатку беларускі, хоць аналагі яго існуюць у многіх еўрапейскіх і азіяцкіх краінах. І доказы аўтэнтычнасці беларускай дуды можна пачэрпнуць у беларускіх музеях, дзе захоўваюцца ўзоры гэтых старажытных інструментаў (напрыклад, у Лепельскім краязнаўчым музеі і інш.) Пра гэтыя факты сёння можна прачытаць на старонках энцыклапедыі „Этнаграфія Беларусі"...

У наш час, дзякуючы высілкам энтузіястаў — даследчыкаў і майстроў па вырабу інструментаў — беларуская дуда атрымала другую маладосць: інструмент вяртаецца ў нацыянальную культурную прастору. Што казаць, калі нават салісты Дзяржаўнага аркестра імя І. Жыновіча ў сваіх канцэртных праграмах выкарыстоўваюць дуду і мелодыі для яе, што выконваліся ў старажытнасці.

А ў якім кірунку сёння ідзе развіццё нацыянальнай дударскай школы можна было пабачыць і пачуць на не так даўно адбыўшымся музычным форуме аматараў гэтага інструмента — „Дударскім фэсце-2006", адроджаным у Беларусі пасля трынаццаці гадоў маўчання. Гэтае музычнае свята сабрала шмат цікавых выканаўцаў на дудзе, стала аглядам якасці тых інструментаў, якія цяпер вырабляюць беларускія майстры, якія сваімі даследаваннямі ў гэтай галіне ўносяць немалую музыказнаўчую бонду ў адраджэнне дударскіх традыцый у Беларусі.

Зразумела, асноўная ўвага і цікавасць да ўдзельнікаў мерапрыемства, якія былі прадстаўлены на „Дударскім фэсце", была звернутая да творчасці і пошукаў ветэранаў руху за адраджэнне беларускай дуды. Напрыклад, вядомы мінскі мастак, майстар і выканаўца Тодар Кашкурэвіч на інструментах сваёй вытворчасці прадэманстраваў гучанне ўсіх тыпаў дудаў, вядомых на Беларусі. Ён таксама распавёў пра дударскі рэпертуар, што выконваўся ў ранейшыя часы. А выкладчык Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры Віктар Кульпін падзяліўся з калегамі вядомым толькі яму рэдкім выканаўчым прыёмам.

Заўважную канкурэнцыю ветэранам-дударам склалі маладыя выканаўцы: тэатр сярэдневяковых мініяцюр „Яварына", удзельнік гурту „Вайдэлот" Зміцер Сіўчын, і адзіная на фэсце дзяўчына-дудар — Аксана Касцян. Гэтыя маладыя музыкі здзівілі слухачоў свежым прачытаннем твораў еўрапейскай і беларускай сярэднявечнай музыкі, цудоўнымі фальклорнымі мелодыямі, танцавальнымі рытмамі. А малады прадстаўнік сямейнай дынастыі фальклорных выканаўцаў і майстроў Козакаў з Віцебска — Слава Козак — здзівіў гучаннем свайго незвычайнага інструмента, выкананага ў форме казы!

Вялікі поспех чакаў беларускія фольк-гурты і гурты сярэднявечнай музыкі, якія выкарыстоўваюць у сваім рэпертуары творы для беларускай дуды. Трэба было самому на хвіліну стаць удзельнікам танцавальнага карагода, каб зразумець тое, наколькі папулярная ў моладзі старажытная ансамблевая музыка!

Гэтую ісціну сваімі кампазіцыямі пацвердзілі магілёўскі гурт „За парогам", які прапанаваў свой варыянт кельцкай музыкі, вакальны ансамбль „Кудмень", удзельнікам якога вельмі блізкі нацыянальны песенны фальклор, што выконваўся пад дуду. У іх выкананні народны танец „Юрачка" стаў гітом гэтага фэсту!

А вось вядомы беларусам Польшчы фальклорны гурт „Ліцьвіны" — піянер ансамблевага выканання народных песень пад дуду — нагадаў слухачам лепшыя кампазіцыі са сваіх ранейшых альбомаў. Гэтыя на дзіва станоўчыя ўражанні былі замацаваны творамі ў выкананні гуртоў старажытнай музыкі „Келіх кола", „Ліцьвін Троль" і кампазіцыямі ў выкананні лідэраў айчыннай сярэднявечнай музыкі, гурту „Стары Ольса".

На жаль, не ўсе выканаўцы змаглі паўдзельнічаць у гэтым музычным свяце, бо шмат якім яшчэ музыкантам ёсць чым падзяліцца з калегамі-выканаўцамі, чым парадаваць слухачоў. Але не трэба хваляваццa, арганізатары абяцаюць новыя сустрэчы выканаўцаў ужо на наступным фэсце, а таксама выданне адмысловага музычнага дыска з запісамі твораў, што гучалі на „Дударскім фэсце-2006".

Анатоль МЯЛЬГУЙ

Пенсіянеры дораць сабе радасць

Рэгіянальнае праўленне Польскага саюза пенсіянераў і інвалідаў у Гайнаўцы вядомае не толькі на Гайнаўшчыне ці ў Падляшскім ваяводстве, але нават па-за межамі краіны. У ім згуртавалася каля 900 членаў, у ліку якіх можна сустрэць людзей розных прафесій і ўзросту. Здавалася б, што гэтая, не так ужо і малая, група „старэйшай моладзі" пражыла свой век і павінна сядзець дома. Аднак гайнаўскія пенсіянеры актыўныя, а гэта дзякуючы шматгадоваму старшыні праўлення Мікалаю Чыквіну. Пад яго ўмелым кіраўніцтвам распрацоўваюцца чарговыя гадавыя планы мерапрыемстваў па інтэграцыі асяроддзя. У іх ліку культурныя вечарыны ў Гайнаўцы, напрыклад, танцавальныя ў Гайнаўскім доме культуры, прымеркаваныя да Новага года, Каляд, 8-га Сакавіка, прывітання вясны. Члены ПСПіІ прымаюць удзел ва ўсіх імпрэзах ладжаных Домам культуры, напрыклад, у свяце печанай бульбы.

Гайнаўскія пенсіянеры часта арганізуюць аўтобусныя экскурсіі па краіне. Наведалі яны амаль усе найбольш атракцыйныя мясцовасці, пабачылі самыя каштоўныя помнікі даўніны, кожны год заязджаюць на Святую Гару ў Грабарцы і Ясную Гару ў Чэнстахове. Па запрашэнні беларускіх калег з Камянца ці Пружан выязджаюць на краязнаўчыя экскурсіі ў суседнюю Беларусь. У рамках абмену прымаюць яны таксама гасцей з Беларусі, знаёмяць іх з турыстычнымі каштоўнасцямі нашага рэгіёна.

Кожны тыдзень, па серадах і чацвяргах, працуе ў Гайнаўцы клуб-бюро гэтай пенсіянерскай арганізацыі. Наведвальнікаў сустракаюць там вельмі сардэчна, з цеплынёй і ўсмешкай, прапануюць шклянку гарбаты і пірожнае.

Пенсіянеры не спадзяваюцца ўжо на лепшае жыццё, дапамогу з боку чарговых урадаў. Падкрэсліваюць, што годнасць, пашана, сумленнасць сталі цяпер пустымі словамі ў нашым палітычным жыцці. За кошт пенсіянераў будуецца цяпер хісткая грамадска-эканамічная рэчаіснасць. „Мы хочам, каб урэшце ў Рэчы Паспалітай насталі добрасумленнасць, справядлівасць, якія прынясуць не чарговую крыўду, але дабро ў індывідуальным і грамадскім сэнсе", — мяркуюць пенсіянеры, якія не ладзяць гучных вулічных пратэстаў, але перажываюць душэўны бунт супраць антыграмадскай палітыкі чарговых урадаў. Улады не вырашылі адпаведным чынам праблемаў састарэлых людзей. Выключэнне іх з сямейнага жыцця і памяшчэнне — нават у шыкарных — прытулках з'яўляецца нечым нялюдскім. Кожнаму чалавеку патрэбная зычлівасць, сардэчнасць, чуллівасць. А ў нашай Польшчы цэняцца толькі людзі працаздольныя, а непрацаздольныя лічацца свайго роду сацыяльным баластам. На вялікі жаль улады забываюць, што пенсіі гэта не добрая воля дзяржавы, а належныя, выпрацаваныя высілкам пенсіянераў грошы.

Ад пенсіянераў адвярнуліся некаторыя партыі. Адыход ад перадвыбарчых лозунгаў выклікае ў іх — ахвяр прымітыўнага капіталізму — асаблівую горыч. Замест таго, каб цяжар перамен перакінуць на багатых людзей, нясуць яго маламаёмныя. Пачуццё загубленасці і бездапаможнасці ахапіла мільёны добрасумленных людзей... Самае трагічнае тое, што шмат людзей страціла надзею на паправу быту, не могуць зразумець ментальнасці тых, якія згаджаюцца на галодныя пенсіі непрацаздольнай часткі грамадства. Задумацца застаўляе адсутнасць уяўлення ўладароў, якія ствараюць цяжкія ўмовы экзістэнцыі мільёнам састарэлых. Ці ж яны самі не састарэюцца?

Ці старыя людзі павінны займацца палітыкай? У адказ чую, што павінны. У грамадстве патрэбныя іх вопыт, жыццёвая мудрасць і веды. Такім чынам пенсіянеры могуць служыць свайму асяроддзю.

Стары чалавек павінен займацца агульнымі справамі. Пенсіянеры — людзі адкрытага сэрца, якія адчуваюць радасць ад кожнага перажытага дня, ад лучнасці з прыродай. Таму не дзіва, што ахвотна ладзяць яны мерапрыемствы на ўлонні прыроды, не прапускаюць аніводнага беларускага фэсту, „Купалля" ў Белавежы, „Сяброўскай бяседы" ў Гарадку ці „Бандарскай гасцёўні" ў Бандарах. Адпачываюць яны і загараюць на пляжах Семяноўскага вадасховішча, Буга, Тапіла, Бахматаў, Рэпчыч і іншых вадаёмаў.

У радах пенсіянераў шмат удоваў і ўдаўцоў, сумуючых па партнёрах, якіх адабрала ў іх смерць. Аднак адзінота застаўляе іх шукаць сабе „палавінку", таму тэма кахання пенсіянерам не чужая:

Я шукаю цябе з тых далёкіх гадоў,
У краіне надзей і няздзейсненых сноў.
Я чакаю цябе, колькі можна чакаць? —
Пакуль хвалі жыцця будуць нас калыхаць.

Пенсіянеры дораць сабе радасць, каб як найдаўжэй не дапускаць да сябе старасці, актыўна ўключаюцца ў культурную дзейнасць. Некаторыя, напрыклад, спяваюць у хорах —царкоўным і Гайнаўскага дома культуры, упрыгожваюць сваімі спевамі шматлікія мерапрыемствы ў сваім асяроддзі.

Калі пытаю старшыню Мікалая Чыквіна, што ў такі складаны час найважнейшае ў жыцці пенсіянераў, чую ў адказ: „Здароўе". І менавіта гэтага гайнаўскім пенсіянерам жадае ніжэйпадпісаны.

Віктар БУРА

Ушанавалі два святы

Святкаванне Дня маці з'яўляецца ў Чаромсе цыклічнай імпрэзай, занесенай у каляндар культурных мерапрыемстваў. 26 мая мастацкую частку падрыхтаваў мясцовы дзіцячы садок. Малечы запрасілі сваіх мам ды выступілі перад імі з вершамі ды песенькамі. Было шмат віншаванняў, а асноўнае зводзілася да пажадання: „Жыві нам мама «сто лят»".

А 27 мая мерапрыемства арганізаваў Польскі саюз пенсіянераў і інвалідаў (ПСПіІ). Нягледзячы на тое, што ўваход быў за білетамі (5 зл. ад асобы), зала была бітком набітая. У сустрэчы ўдзельнічала больш за сто дзесяць чалавек. Сярод удзельнікаў пераважаў жаночы пол. Вядома, іхняе свята. Прыйшлі як адзінокія, так і шлюбныя пары з Чаромхі-Станцыі, Кузавы, Чаромхі-Вёскі, Ставішчаў, Вулькі-Тэрахоўскай, а нават з больш адлеглых вёсак — Апакі, Баброўкі і Дабрывады.

Прысутных прывітаў старшыня мясцовай суполкі ПСПіІ Юзэф Дубковіч. У кароткім выступленні расказаў ён аб важнейшых напрамках дзейнасці арганізацыі ды павіншаваў жанчын са святам. Аляксандр Баярунец у сваю чаргу зачытаў верш прысвечаны гэтай падзеі. Музыканты разам з публікай праспявалі „Сто лят" і „Многае лета". Было шампанскае і сціплы пачастунак. Большасць удзельнікаў прыхапіла з сабою штосьці „для духа". Калі госці раскашаваліся пачастункам, музыканты весялілі публіку. Адборны калектыў — Сцяпан Копа (акардэон), Готфрыд Грубоўскі „Федзя" (арган) ды Барбара Згет (вакалістка) — іграў бадзёра, не ленаваўся. Двое апошніх удзельнікаў калектыву ў чаромхаўскіх пенсіянераў гасцявалі неаднойчы. А Сцяпан Копа добра вядомы „Вульчанкам" ды спявачкам з Чаромхі-Вёскі, з якімі выступаў на супольных канцэртах. Пасля некалькіх чарак публіка заварушылася. Пачуліся песні. Барбара Згет прапанавала заспяваць „Рыдна маты моя". Зала падтрымала. Затым выступілі „Вульчанкі", якія свой выступ пачалі з песні „Там у вышнёвому саду". Сцяпан Копа не вытрымаў, сышоў са сцэны і акампаніраваў спявачкам. Да кампаніі далучылася Люба Салінская з Чаромхі-Вёскі. Песні змяняліся як у калейдаскопе: польскія, беларускія, украінскія і рускія — ад найбольш вядомых, а на „агульках" закончыўшы. Быў і канцэрт па заяўках. Вакалістка Барбара Згет прысвяціла старшыні Дубковічу песню „Юзэк", а Раіса Баярунец —ветэранам вайны „Кацюшу". Апошняе прысвячэнне не было выпадковым, паколькі ў ліку прысутных знаходзіліся франтавікі. Можна сказаць, што ўдзельнікі мерапрыемства ўшанавалі два святы: Дзень маці і Дзень перамогі. А я імпрэзу лічу ўдалай. Гэта заслуга як арганізатараў, так і музыкантаў.

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Накład: 1 485 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Рэдактар тэхнічны: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Мацей Халадоўскі, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2006 r. upływa 5 czerwca 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2006 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

СУСТРЭЧЫ Ў ДАРОЗЕ

Па дарозе за „прондам"

Яна — адна з больш вядомых жанчын Гайнаўшчыны. Можа, не так па прозвішчы, як у твар. Пару дзесяткаў гадоў заходзіла да людзей дадому. Проста — Ліда. Спісвала з лічыльнікаў выкарыстанне электратоку ў гаспадарках вёсак і самое Гайнаўкі. Гэта не толькі пройдзеныя кіламетры і спісаныя кілаваты. Гэта нагоды для размоў, пазнання чалавечых таямніц і характараў. Больш за 50 вёсак пачынаючы ад Макаўкі, Рыбакі, Цімахі, Тапіла, Пілікі — аж пад Сямятычы кідалі. Бельскі энергетычны раён. Яна — адзіная жанчына з інкасатараў. Няма пра што і пісаць — работа як работа, сумленна чалавек выконваў абавязкі.

— У адной вёсцы дзед кажа: а мой сусед крадзе электраток. А як гэта робіць? Дроцік пераключае. Ведае, калі правяраць прыйдуць, дык тады ўсё ў парадку. Верыць старому ці не — трэба было б памяняць лічыльнік, узяць яго ў лабараторыю. А можа дзядзька на тое самае робіць, каб клопату суседу нарабіць. У Гайнаўцы, ужо калі з камп'ютэрам хадзіла, у адным доме кожны раз нічога лічыльнік не паказваў. Гаспадыня кажа, што яны тут не жывуць, не карыстаюцца электратокам. Суседка запярэчыла — жывуць, сям'я ў чатыры асобы. А жанчына з суседняга дома кажа: Чаму ў вас такая несправядлівасць! Была ў мяне мая найлепшая каляжанка, што жыве там і там, і смяецца з мяне: „Дурная, што ты столькі плаціш за электраток. Я маю дома дзве маразілкі, а плачу толькі пастаянную плату". Ну, гэтак не будзе, калі яна яшчэ і хваліцца — трэба праверыць лічыльнік. Прыехалі, памянялі лічыльнік. Я прыйшла, а яна мяне дадому запрашае і з прэтэнзіямі: пані, чаму мне лічыльнік памянялі?! А вось што было з ім — манцёры ёй былі ўставілі такі лічыльнік, што калі што-небудзь працавала, ён круціўся наадварот. Пакараць не маглі — лічыльнік быў запламбіраваны. Адна бабуля ў вёсцы сунула мне ў рукі 500 злотых: зрабеце штось, каб я так шмат за пронд не плаціла. Ці вы знаеце, кабета, што вы ў мяне просіце? Не, шчыра глядзіць мне ў вочы жанчына. „Пронд" „казённы", дзяржаўны, а каб выжыць, дык трэба перахітрыць уладу. А я па-нашаму кажу, наш чалавек, значыць, можна быць шчырым. Але нашы людзі сумленныя, прыстойныя. Жыццё пражыць — не поле прайсці. Пра кожнага кніжку можна напісаць. Вы там у „Ніве" ведаеце, якія нашы людзі — ходзіце да іх, пра жыццё пытацца. „Я мужык-беларус, пан сахі і касы..." — такія тэксты не забываюцца...

Міра ЛУКША

„Даўціпы"

Андрэя Гаўрылюка

Лекар да пацыента:

— Не магу ўцяміць, навошта вам снатворныя таблеткі, калі вы і так усю ноч праседжваеце ў рэстаране.

— Гэта не мне, гэта жонцы.

* * *

Муж раней вярнуўся з камандзіроўкі, падыходзіць да ложка і дзівуецца:

— Ну так; мая жонка, мой сябра, нават мае прэзерватывы.



Калегі з „Нівы"

Зямелька-маці

Шумяць вербы каля грэблі,
Вясну абвяшчаюць,
Кветкі ў лесе зацвілі,
Пайшоў дождж у маі.

Ураджайны будзе год,
Усе будзем шчаслівы,
Бабка і дзед з унукамі
Жыці будуць міла!

Дзедка ўнукаў навучае
Зямлю-маці шанаваць,
Яе песціць трэба так,
Як песціла вас маці.

Нам жыццё даюць зямля
Ды чыстае паветра,
Сонейка нас агравае,
Каб жыць было лепей.

Шануйце, унукі,
Нашу зямельку-маці
Ды вучыце сваіх дзетак
Яе шанаваці!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27			

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — пагаворку.

1. цвёрды мінерал са слаямі рознай афарбоўкі, які выкарыстоўваецца для тэхнічных і ювелірных мэтаў = 17 __ 16 __ 13 __ 12 __;

2. правадыр гунаў у палове V стагоддзя = 27 __ 3 __ 2 __ 24 __ 25;

3. альфа Ліры, найярчэйшая зорка паўночнага паўшар'я = 22 __ 9 __ 26 __ 23 __;

4. брат дачкі = 11 __ 21 __ 8 __;

5. раскідванне насення ў глебу = 6 __ 7 __ 19 __ 20 __ 18 __;

6. доля удзельніка капіталаўкладання = 1 __ 4 __ 5 __ ;

7. канава або крык жывёл = 14 __ 15 __ 10 __ .

(Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 19 нумара

Бучач, Науру, ода, соль, хлеў, Ціт.

Рашэнне: **Хоць сілу трачу, але дно ўбачу..**

Кніжныя ўзнагароды высылаем: **Лявону Федаруку** з Рыбал і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

18.06 – 24.06

Баран (21.03. — 19.04.) Да 21.06. не рассыпайся абяцанкамі, не гаварыі зашмат аб сваіх планах, каб цябе не падставілі. Здабыць сэрца каханай асобы памогуць фантазія, вогненны тэмперамент ды адвага. Тваю ўвагу зойме асоба як спелае віно.

Бык (20.04. — 20.05.) Ідэальны час на прыбытковыя інвестыцыі. Добра адчуеш, як абарочваць немалымі грашыма. Твае знаёмыя могуць цябе здзівіць; нават з'еўшы з кімсьці бочку солі, можна яго не ведаць.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Венера ў тваім знаку — убачыш свет у колерах вясёлкі і ўрэшце адкрыешся на каханне! Моцная падтрымка і Сонца. Даведаешся шмат дэталяў з гісторыі свае сям'і (не можаш адказваць за грахі продкаў!).

Рак (22.06. — 22.07.) Ад Сонца — упэўненасць, адвага, рашучасць, моцны падарунак энергіі таксама і ад Месяца. Па колькасці сардэчных заваёў можаш раўняцца з Казановай!

Леў (23.07. — 22.08.) Можа мучыць цябе сумленне за твае паводзіны з людзьмі, асабліва з найбліжэйшымі. Замест раздумваць над памылкамі, старайся іх выправіць. Затое ідэальныя адносіны з шэфам і сябрамі.

Дзева (23.08. — 22.09.) Калі маеш шанц на павышэнне ці дабаўку, пакуль не збірайся на канікулы. Пакажы свае моцныя бакі, спрытна выкарыстай тое, у чым ты найлепшая. Затое магчымыя сустрэчы з непрыемнымі, дапякаючымі людзьмі ў складаных сітуацыях.

Шалі (23.09. — 22.10.) Знакамітыя адносіны з супрацоўнікамі, поспехі ў перамовах; лёгка пераканаеш усіх да сваіх ідэй. Палымяны раман можа аказацца толькі мімалётным знаёмствам.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Можаш шмат здабыць, хоць не мусіш выказацца тактоўнасцю і далікатнасцю. На ворагах не пакінеш сухой ніткі. На шчасце з усіх канфліктаў выйдзеш цэлы. Затое ў фінансах могуць цябе збіць з панталыку.

Стралец (22.11. — 21.12.) Дбай аб здароўе, асабліва аб сэрца. Дома малое замяшанне, дзеці могуць давесці цябе да гарачкі. 18-21.06. можа табе здавацца, што перанясеш горы, ды можаш падвесці ў самых простых справах. 20-24.06. будзеш разгублены, што выбраць — ці тое, што кажа розум, ці тое — што сэрца.

Казярог (22.12. — 19.01.) З 20.06. ты небаявіты, крыху разлезлы, можаш пасварыцца з шэфам, бацькам ці сябрамі. Хоць агульна робіш добрае ўражанне, а аматараў не бракуе.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Прыхільныя зоркі. Кампанейскае ажыўленне, добры настрой, чуткая інтуіцыя. Толькі Вадалеі з 7-11.02. менш самаўпэўненыя. Адпусці балючыя размовы — мінулага і так не зменіш.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Разам з уваходам паўночнага вузла Месяца ў знак Рыб у тваім жыцці пачнецца зусім новы этап! Будзеш мець шмат нагод, каб рэалізаваць свае найбольшыя мары. 18-21.06. будзеш злавацца, таму блага сябе адчуваць; не афармляй у гэты час важных спраў.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960

Ніва
ПРА МІНУЛАЕ

ВЯРТАЎСЯ З ФРАНТОЎ

Успаміны Аляксандра МІКШЫ з Пілік, народжанага ў 1916 годзе.

У 1939 годзе немцы пад Бельск дайшлі, але зараз адступілі. Гаварылі, што непадалёк генерал Гудэрыян прымаў парад сваіх войск.

Мяне тады тут не было, бо ў лістападзе 1937 года я быў прызваны ў войска, а ў верасні 1939 года меў вярнуцца. Служыў я ў 27 палку уланаў імя караля Стэфана Баторыя. Мой полк стаяў у Нясвіжы і быў у складзе Навагрудскай брыгады кавалерыі; іншыя два палкі брыгады стаялі ў Навагрудку і Баранавічах. Недалёка Нясвіжа была дзяржаўная мяжа і людзі гаварылі, што тут польскі, а там бальшавіцкі лес. У нашай часці было больш хлопцаў з нашых старон, але адносна мала, бо на службу непадалёк савецкай граніцы беларусаў амаль не бралі. Перад маім прызывам да нас дахаты тройчы прыязджалі паліцыянты і расследавалі, ці я часам не прыхільнік камунізму, каб там не ўцёк да саветаў.

Служыў я ў швадроне станковых кулямётаў. Стаялі мы ў казармах, у якіх у царскі час была артылерыя. Наш швадрон налічваў каля ста салдатаў і меў на ўзбраенні восем станковых кулямётаў: чатыры дулам узад перамяшчалі на конных тачанках з жалезнымі коламі, а чатыры вазілі на ўюках, у спецыяльных сумках — з аднаго боку каня вешалі кулямёт, а з другога ножкі да яго; ва ўюках на другім кані вазілі амуніцыю. Кожны ўлан меў сабе каня, але апекаваўся двума; другі быў для штабных службоўцаў, у тым ліку афіцэраў. Кожны салдат-кавалерыст меў на асабістым узбраенні шаблю і невялікі карабін kbk (krótka broń kawalerii) з багнетам. Абучалі нас і на конях ездзіць, і ваяваць як пяхота. У пяхотным варыянце атрад ехаў тройкамі, двух саскоквала з коней і станавілася пехацінцамі, а трэці тых коней адводзіў.

Першы год прызыўны кавалерыст абучаўся ваеннай справе, а ўжо на другі год службы яго бралі на г.зв. штат і ён выконваў бытавыя вайсковыя задачы, напрыклад, некаторых прызначалі кухарамі. Мяне назначылі кур'ерам пры штабе, дзе я насіў паведамленні. Калісь такой тэхнікі, як сёння, не было, калі розныя справы можна перадаць па тэлефоне. У палявых умовах тэлефонныя правады вазілі на возе і расцягвалі іх толькі тады, калі між часцямі былі большыя адлегласці; у іншых выпадках сувязь ажыццяўлялі кур'еры.

4 сакавіка 1939 года ў рамках мабілізацыі нашу брыгаду перадыслацыравалі чыгункай пад Дзялдова. З эшалонаў выгрузілі нас у Серпцу, а далей, цераз Млаву, паехалі конным транспартам. Каля Дзялдова размясцілі нас у вялікіх каменных стадолах; ні сена, ні збожжа ў тыя стадолы людзі не вазілі, бо займала іх войска. Капалі мы акопы перад узгоркам і траншэі на ўзгорку над ракой Дзялдоўкай.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Аляксандр Мікша

1 верасня 1939 года нашых пазіцый не бамбілі, не абстрэльвалі. Ад нас было відаць, як нямецкія самаходы ў Дзялдова ехалі; ад нас ніхто да іх не страляў. Нашых чатырох разведчыкаў паехалі за рэчку, там у лесе напаткалі пецярых нямецкіх салдат. Адзін з нашых уцёк, а тыя траіх злезлі з коней і сталі біцца з немцамі. І немец адзін уцёк. Наш харунжы двух немцаў зарубаў, яго таварышы па адным. Харунжы дагнаў яшчэ таго ўцякаючага немца і таксама яго зарубаў — пабілі ўсіх немцаў. Вярнуліся назад, але таго нашага дэзерціра не судзілі.

Пасля некалькі дзён стаялі; ніхто не наступаў — ні мы, ні немцы. А пасля прыйшоў нам загад усё згортваць, рыхтаваць коней. Увечары пакінулі мы свае пазіцыі і сталі адступаць, ехалі ноччу. Доўгі час не бачылі немцаў. Калі ішлі баі пад Кутнам, на Бзуры, мы ў Плоцку пераправіліся праз Віслу і трапілі ў Кампіноскую пушчу, там было многа ўцекачоў з Варшавы. Загадалі нам адступаць праз Новы-Двор-Мазавецкі. Праз Рэмбертаў выйшлі на люблінскую шашу. Прайшлі праз Гарволін і больш ужо ў большыя гарады не заходзілі. Нас хацелі вывесці ў Румынію, але нямецкія танкі нас апярэдзілі.

Між Любартавам і Люблінам ёсць мястэчка Немцы і там немцы сталі перад намі. Моцна нас бамбілі, за намі ехаў нямецкі танк. Некаторых кулямётчыкаў паслалі той танк абстрэльваць і ён пабіў іх. І ў нашай часці былі забітыя і раненыя, але яе не разбілі і мы падаліся далей. Спыніліся на ноч непадалёк ад палявога нямецкага аэрадрома. Быў загад не атакаваць яго, толькі ноччу на яго наскочыць. Але адзін вартаўнік не вытрываў і выстраліў; тады немцы акружылі нас.

Вечарам падаемся далей, у лесе напаткалі некалькі дзесяткаў немцаў на матацыклах; яны — ходу. А мы з лесу выехалі і праз поле, па загонах, ехалі. Немцы былі недалёка і сталі па нас з кулямётаў біць трасіраванымі кулямі. А мы панагіналіся і яны нават нікога з нас не ранілі; мы паехалі далей. Заехалі ў іншае месца, а там людзі гавораць, што немцы сем польскіх дывізій разбілі. Коней на полі было там як авечак; я там змяніў свайго каня.

Ехалі далей, а немцы ўжо за намі цэлы час сачылі, час ад часу былі між намі перастрэлкі. Мы перамяшчаліся на конях бакавымі дарогамі, а яны па шашы на самаходах. Падышлі мы недзе пад Львоў. Удалося нам наскочыць на нямецкі табар — набралі там ежы, некаторыя набралі і грошай з нямецкай тылавой касы.

У адным месцы раніцай мы рыхтаваліся да адпачынку каля ракі. Убачылі немцаў, што да нас наблізіліся; мы прыгатавалі кулямёты, але ўбачылі, што немцы без карабінаў. Яны з'ехалі да ракі, а камандуючы нашай Навагрудскай брыгадай кавалерыі генерал Андэрс апрануў пілотку, выйшаў да іх і спытаў, чаму яны без узбраення.

— Мы не будзем з вамі біцца, — сказалі немцы. — Абмяняймася палоннымі і разыдземся; мы паедзем на заходні фронт.

І так мы разышліся, праехалі мы побач немцаў, не біліся. Ад'ехалі далей, сталі на адпачынак у вёсцы, абед варым; я быў у крайняй хаце. Абед ужо амаль гатовы, а з лесу выязджае двух саветаў з карабінамі і кажуць нам не ваяваць. Я крыху пагаварыў з імі, а тут выскачыў наш вахмістр з пісталетам і стаў на тых саветаў крычаць. Яны ўцяклі ў лес.

А ў нас адразу паднялі трывогу; так мы без абеду асталіся. Дзень і ноч едзем, а нас то адтуль, то адгэтуль савецкая разведка абстрэльвае. Каля аднае вёскі брама стаіць... Я думаю: што гэта за свята? Бо ў нас такія брамы стаўлялі як архірэй прыязджаў. У другой вёсцы таксама брама стаіць, а на ёй напісана „Да здравствует Советская Армия"; тады я здагадаўся, што гэта за свята. Пасля людзі сказалі, што за такое свята некаторых актывістаў расстралялі.

Зайшлі ў вялікую вёску, каб пахарчавацца. А там з кулямётаў саветы па нас рубанулі. Мы ходу ў лес. У лесе лужок быў і там коні ў дышлёвы воз запрэжаныя; мабыць, ім польскія афіцэры ехалі. Забралі мы з таго воза што знайшлі і падаліся далей. У лесе далучылася да нас яшчэ нейкае польскае войска; гаварылі, што гэта была Валынская брыгада. А саветы ўжо нас танкамі акружылі, іхнія самалёты над намі лёталі. І рана генерал Андэрс здаў наша войска без бою. Аставалася шэсцьдзесят кіламетраў да румынскай граніцы — адна ноч кавалерыйскага маршу.

Рускія адразу палонным на рукі глядзелі: калі спрацаваныя, то адпускалі, а калі чыстыя, дык забіралі ў палон, бо ўласніка такіх рук лічылі афіцэрам. І мне прыглядаліся пару гадзін. Ад'язджалі танкі і адзін сказаў забраць нас на іх.

— А як будуць уцякаць? — спытаў нехта.

— Мы своё дело знаем, — адказаў іншы.

Ехалі да адвячорка, загадалі злезці і нікуды ноччу не хадзіць, а рана — куды каму дарога. Рана я з сябрам ад Познані зайшлі да гаспадароў, яны нас накармілі і мы разышліся.

Ішоў я некалькі дзён адзін, дайшоў да Уладзіміра-Валынскага. Зайшоў у краму, хлеб у жыдоў купіў. Зайшоў на станцыю, а там поўна польскага войска; грузяць іх у ва-

[працяг ☞ II]

9 770546 196000

[I ☞ працяг]

гоны. Я пытаю:

— Куды той поезд?

— А куда нужно? — спытаў салдат.

— На Ковель.

— Садись!

Я сеў. Але бачу: дзверы зачыняюць і дротам абкручваюць. І павезлі нас на Ковель, але адтуль не ў Брэст, а ў Роўна направілі. У чыстым полі поезд стаў і сказалі нам ісці ў вёску есці прасіць. Я думаў адтуль уцячы, але не ўдалося. Паелі і зноў на поездзе паехалі. Вечарам сталі ў лесе, пуцёў многа, на іх эшалоны з дошкамі. Была гэта станцыя Клевань, 27 кіламетраў ад Роўна. Я выйшаў з вагона, спусціў нагавіцы і так прысядкам пад вагонамі ўцёк у лес. Знайшоў дарожку, прысеў за кустом. Чую — бягуць, сваі! Я крыкнуў, яны пачакалі і я да іх далучыўся. Забрахаў сабака, мы падаліся ў той бок, але ніякіх будынкаў не было. Выйшлі на смуг, там сена ў капіцах стаяла і мы ў іх паснулі. Прачынаемся, а сонца ўжо высока. Нейкі дзядзька пасвіў коней між лесам, мы яго пра дарогу пытаем. Былі мы з розных бакоў і ён нам усім паказаў напрамкі. Мы там развіталіся, абняліся і разышліся.

Я зноў на Ковель іду. У кожнай вёсцы дружыннікі стаялі з карабінамі і правяралі, абмацвалі. Пытаю іх, дзе там можна пераначаваць.

— Завядзі яго, — кажа адзін другому, — у тую хату, дзе найбольш дзяўчат; там яго найлепш пакормяць.

І так я ішоў. Удалося сесці на поезд, заехаў у Ковель. Але з вагона не вылажу. Рана пытаю чыгуначнікаў, як на Брэст і Беласток прабрацца. Яны сказалі, што чыгуначны мост узарваны, але можна прайсці; сказалі, як ісці да шашы, што на Брэст.

Дайшоў я да тае шашы, а там піша: „Brześć nad Bugiem 128 km". Іду. Зайшоў пераначаваць у адну хату. Рана гаспадар у лес выбіраўся, будзіць мяне:

— Калі хочаш паснедаць, то спі яшчэ, а калі не, то едзем.

Пад'ехаў я з ім і далей зноў пяшком; тры дні ішоў. Даходжу да Мухаўца, на ім мост сарваны, але адзін лодкай перапраўляў. Пераехаў з ім і я, пайшоў далей. Пабачыла мяне нейкая панюся:

— O Boże! — усклікнула, — Polski żołnierz! Skąd się pan wziął tutaj?

Я сказаў, што ў Бельск іду. Яна асцерагла мяне, каб мінаць бальшавікоў, сказала, як абысці горад. Я пайшоў так як яна сказала, на вечар дайшоў да Матыкалаў, там сеў на поезд, якім прыехаў у Бельск.

У Бельску на пуцях саветы кастры паляць, баюся. Але Бельск я ведаў, мінуў іх. Каля RKU варта ў браме — трэба вяртацца. Абышоў я браньскай шашою і праз агароды на сваю шашу выйшаў. Каля Асушка ўбачыў самаходы на шашы, дык я зноў у поле і да свае хаты.

Пастукаў у акно, бацька адчыніў, я ўвайшоў, гавару. Бацька лямпу запаліў, мама не пазнае мяне. А сястра, якой дзесяць гадоў было, усклікнула:

— Гэта Саша!

Тады і бацькі пазналі.

Раней завітаў да нашых мой сябра з-за Браньска і сказаў, што мяне на фронце снарад смяротна параніў, ногі мне абарвала. І мяне ўжо дома і на вёсцы аплакалі.

А на фронце я палявой дарогай вёз у штаб дакументы. А з недалёкай вёскі сталі страляць па мне. Я адразу з каня ўпаў, але трымаў яго. І як перасталі страляць, я зноў на каня сеў і паехаў, але ўжо пазней у свой полк не вярнуўся і калегі думалі, што я забіты. А я нават ранены не быў.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Байцам, што не вярнуліся

Бывала, хадзіў я па Піліках у польскай уніформе, але рускія ўжо мяне не чапалі.

У 1940 годзе сталі саветы каля Пілік, з боку Бельска, дзе цяпер новы касцёл, будаваць аэрадром. Навозілі жвір са жвіроўні, што па Браньскай вуліцы, каля жыдоўскіх могілак. Назначылі па дзвесце метраў жвіру ад каня навазіць, а пасля атрымалася яшчэ больш. Вельмі цяжка было выканаць гэта, бо на воз змяшчалася па 15-20 сотых метра. І чэргі былі і да жвіроўні, і на аэрадром.

Таксама ўзгорак зямлі трэба было зняць. І камяні вазілі, там машына такая была, што камень малола, а з яе цэмент выходзіў. Была там пабудавана і глыбінная студня. Усё рабілі на месцы і ўсё клалі. Але да вайны аэрадрома не ўспелі збудаваць. Самалёты прыляцелі, многа малых знішчальнікаў, але стаялі на траве; на дарожку, што будавалі, ніводзін самалёт не стаў.

Каля аэрадрома быў дол, у той дол бомбы звозілі, тысячы іх навезлі, вялікі ненакрыты склад там зрабілі. З вясны 1941 года бралі нашых хлопцаў у той склад тыя бомбы чысціць. Але мяне і яшчэ аднаго не прынялі, бо нашы браты былі ў нямецкім палоне.

Калі ўспыхнула новая вайна, мяне ў Піліках не было. Тады немцы ўсе тыя самалёты спалілі, а бомбы ў лес пад Ягуштова вывозілі і ўзрывалі; асколкі ад іх аж да Пілік даляталі — адзін цётцы палатно прабіў, што на лузе сушыла.

19 мая 1941 года забралі мяне пад Шапятова на „обучку", на шэсць тыдняў. Трапіў я ў процітанкавую артылерыю. Жылі ў лесе, у палатках. Напярэдадні вайны кіно да нас прыехала, моладзь з вёсак сышлася. Я дзяўчат пра Гадышэва спытаў, яны сказалі, што яно за некалькі кіламетраў.

— A skąd bojec tak po polsku umie? — пытаюць мяне.

— Moja rodzina była wywieziona, — адказваю, — ale ja język zachowałem.

А рана, у нядзелю, усё затрасло ся. Недалёка, у Высока-Мазавецку, аэрадром быў і немцы яго бамбілі. Афіцэры кажуць нам, што гэта манеўры, але крычаць уставаць. Выстраілі нас у лінейку за лесам, там набівалі патроны ў стужкі. Вечарам пытаюць, хто ў войску служыў; я прызнаўся. Мяне назначылі разводзяшчым варты і кожныя паўгадзіны трэба было варту змяняць, нават прыснуць немагчыма было. Рана нямецкія самалёты наляцелі на фабрыку крухмалу, разбілі яе.

Наш полк адступае. Зайшлі ў палкавы склад, што ў маёнтку з пустакоў быў, кажуць браць што трэба. Я ўзяў сабе афіцэрскія нагавіцы, компас. Адступаем, а з лесу штораз нехта па нас страляе. Капітан пасадзіў мяне на каня, каб па мне білі. А я ровам еду, пахілены, і мяне кулі не кранаюць.

Дайшлі да Суража, мост там узарваны быў, пераначавалі. Акапаліся, два дні пастаялі, ніхто на нас не наступае і мы падаліся ў напрамку Беластока. Пераначавалі на смузе і я там бок прастудзіў — спаў глыбокім сном, бо раней некалькі ночаў не спаў.

У лесе перад Беластокам разбілі мы нямецкі батальён. Думалі, што гэта самыя афіцэры, бо валасы мелі, але ў немцаў і салдатам можна было не стрыгчыся дагала. Дайшлі да Беластока, адзін стаў са смуга да нас страляць, то мы яго адразу забілі. За Беластокам многа салдат пабітых ляжала. Мы пайшлі ў напрамку Валілаў. Адзін салдат гаворыць мне:

— Куда ты идёшь? Иди домой!

І калі наляцелі нямецкія самалёты, я стаў хавацца і ўжо з адным ад Гацькоў адыходзім у свой бок. Выйшлі каля Гарадка, а там лесу няма, няма як шашу перайсці. Заселі мы ў кустах і глядзелі, як па шашы нямецкія самаходы едуць. Удалося нам перабегчы шашу; я падаўся ў адну хату, ён у іншую.

Пераначаваў я, гаспадар мяне пераапрануў і на другі дзень пайшлі мы з сябрам праз палі. Ідзем мяжою, а насустрач нам немцы таксама межамі ідуць. Мы не адзываліся і так прайшлі, не чапалі нас.

Да вечара дайшлі да Зубава, пытаю чалавека пра колішнюю суседку, што ў Зубава замуж выйшла.

— А навошта яна табе? — пытае.

— Хачу пераначаваць.

— Не ідзі туды, бо ўдадуць, — кажа. — Начуй у мяне.

Павячэралі мы і пайшлі з гаспадаром у клуню, каб там пераначаваць. Гаварылі доўга і на канец гаспадар прызнаўся, што пра суседку салгаў, хацеў затрымаць нас у сябе, каб даведацца, што ў свеце дзеецца. На досвітку гаспадар выязджаў, спытаў ці едзем з ім, ці будзем чакаць снедання; мы паехалі.

Хацеў я Бельск абысці. На Галавескай шашы, перад ПОМам стаяў будынак ПУРа. Бачу: бяжыць немец з карабінам і крычыць да мяне. Завёў ён мяне ў той ПУР, дзе размясціўся нямецкі палявы шпіталь, які цяпер эвакуіравалі і той немец лавіў людзей, каб грузіць той шпіталь. Была нядзеля — тыдзень ад пачатку вайны. Людзі з Парцава ішлі ў Бельск у царкву і іх таксама прытрымалі для загрузкі.

А мяне лекарка затрымала, яна чыста па-руску гаварыла, і пытае, што я тут раблю, бо я быў абстрыжаны, значыць — салдат. Я сказаў ёй, што працаваў цывільным пры пабудове аэрадрома ў Ваўкавыску і вяртаюся ў Пілікі. Яна праверыла ўсё на карце, але загадала немцу завесці мяне ў RKU; там, па Дубяжынскай вуліцы, быў якісь савецкі лагер і той салдат мяне туды здаў.

Загадалі ваду прынесці, каб абед варыць. Я пайшоў, думаю мо каго знаёмага пабачу, паведамлю. Падышоў я да плота, але ніхто знаёмы не праходзіў. Зварылі абед, капусняк з мясам, добры! Але няма яго ў што ўзяць. Знайшоў я кусок кардону, скрунуў трубку, набраў гарачага супу, але ён парыў і я яго выліў.

Пачынаюць грузіць на самаходы, па трыццаць чалавек, і вывозіць на сямятыцкую дарогу, у бок могілак. Я не спяшаў, асталося нас семнаццаць чалавек. Паліў дождж, загадалі хавацца. Дождж перастаў, але самаход ужо не прыехаў і мы асталіся.

Былі ў тым лагеры людзі сагнаныя з палёў. Яны сталі бунтавацца. Тады загадалі збірацца ў групы, хто каго знае, пісалі пропускі і звальнялі дадому, але дазвалялі ісці толькі днём. А я нікога не знаю і мяне ніхто не знае. Сталі збірацца тыя, што ў напрамку Нарвы, іх шаснаццаць налічылі. І я лезу між іх; адны прапускаюць мяне, іншыя баяцца, але неяк я ўлез усярэдзіну групы. Афіцэр пералічыў нас — замнога. Але той, што раней лічыў, сказаў, што дакладваў пра семнаццаць. І так мне ўдалося выйсці з лагера.

У Бельску я баяўся адлучацца ад групы. У Катлах зайшоў да знаёмага, пераначавалі мяне. Рана яго маці сказала мне пераапрануцца. Далі мне кошык і я іду ў свой бок. На рацэ Белай траіх немцаў ладуюць мост. Адзін падышоў да мяне, зняў мне шапку — салдат! І тыя двух падышлі. І махнулі рукою. А я ўжо Бельска не мінаў і так дадому вярнуўся.

Пазней немцы бралі мяне валёнкі рабіць для ўсходняга фронту. Давалі дрэнную воўну ды і нашы валёнкі былі для галёшаў і яны не вытрымлівалі суровых франтавых выпрабаванняў.

Пасля валёнак нас бралі разгружаць бомбы для самалётаў, бо і немцы трымалі вялікія самалёты на „нашым" аэрадроме. Калі набліжаўся фронт, то тыя самалёты адляталі ў Далубова, каб іх саветы не збамбілі. Раней саветы не дазвалялі нават здалёк глядзець на іхнія самалёты, а немцы дазвалялі нават кароў па аэрадроме пасвіць, сярод сваіх бамбардзіроўшчыкаў.

Немцы аэрадрома не разбудоўвалі, але хацелі нешта ў лесе для самалётаў будаваць, нават туды дарогі праклалі. А пасля вайны тыя пліты, што саветы паклалі для самалётаў, забралі ад нас і рынак у Бельску, што ад Арэхвіч, вымасцілі.

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Пачаткі вайны на Беласточчыне

Другая сусветная вайна пракацілася праз нашы землі, праз біяграфіі жыхароў Беласточчыны. І хаця тая вайна пакінула след у людскіх успамінах і ў дакументах, усё яшчэ астаецца полем даследавання, дзе ранейшыя сінтэзы дапаўняюцца чарговымі. Справе сінтэзу ваенных падзей таго часу на нашай тэрыторыі прысвяціў свае зацікаўленні спадар Ян Нікалаюк, ураджэнец Райска, афіцэр Памежнай стражы.

Я спаткаўся са спадаром Нікалаюком каб распытаць яго пра вынікі ягонай працы накіраванай на сінтэз мясцовых баявых дзеянняў. Такія доследы вельмі складаныя, беручы пад увагу адсутнасць дакументаў, асабліва ніжэйшага рангу, больш дэталёвых. Напрыклад, ход ваенных падзей верасня 1939 года асвятляюць, пакуль, толькі некаторыя захаваныя польскія загады і ўспаміны вядомага нямецкага генерала Гудэрыяна, які камандаваў нямецкім ударам з Усходняй Прусіі ў напрамку Брэста.

У 1939 годзе на Беласточчыне многіх баёў не было. Тут большая бітва адбылася ў раёне Замбрава і Меня, дзе 10 верасня немцы разбілі 18-ю польскую пяхотную дывізію са складу Самастойнай аператыўнай групы „Нарва". Іншым часцям ад гэтай групы ўдалося пераправіцца праз Нарву між Суражам і Страбляй ды, мінаючы Брэст, які перад імі заняў Гудэрыян, трапіць да войск генерала Клеберга.

У нас немцы дайшлі да лініі Дубічы-Царкоўныя — Махнатае, да Гайнаўкі не даходзячы. У самой Гайнаўцы — не ў лесе ад Белавежы! — былі склады тылавога забеспячэння, якія пазней занялі саветы.

У 1941 годзе найбольшая бітва між нямецкімі і савецкімі часцямі разыгралася між Браньскам і Боцькамі ў першыя два дні вайны. У тым раёне адступаючая ад Цеханоўца 86 савецкая стралковая дывізія злучылася з 13 Механізаваным корпусам, у складзе якога было некалькі соцень танкаў, і яны прынялі бой з немцамі, якія туды пераправіліся праз Буг між Сямятычамі і Драгічынам. Калі немцы занялі Браньск, савецкія фарміраванні сталі адступаць: частка ў напрамку Бельска, частка ў напрамку Лап. 25 чэрвеня яны ўступілі ў бой каля Рыбал, а пасля сталі нязладжана адступаць у напрамку Зэльвы. Пад Зэльвай адзін нямецкі батальён узяў 36 тысяч савецкіх палонных.

В.А. Грамыка. Баллада пра апошнюю кулю. 1968.

Першыя два дні вайны баі адбываліся на лініі Ломжа — Асавец, якія прытарможвалі наступленне немцаў з Усходняй Прусіі. У днях 24-26 чэрвеня большыя баі разгарнуліся на лініі Крынкі — Шудзялава — Гродна. Туды трапіла савецкая 6 Кавалерыйская дывізія, якая адступала ад Ломжы. Апынуўся там і 6 Механізаваны корпус пад камандаваннем генерала Болдзіна, які да вайны займаў казармы ад Харошчы да Супрасля, а ў яе пачатку адступаў ад Беластока ў напрамку Валіл. (Паводле кнігі Я. Елісеева „На белостокском направлении", М-ва 1971, у пачатку ваенных дзеянняў Болдзін быў намеснікам камандуючага Заходнім фронтам. Ад бітвы за Маскву ён камандаваў 50-й арміяй, якая ў ходзе Беларускай аперацыі ваявала на паўднёвых подступах Мінска і праз Карэлічы, Гродна ды Дуброву дайшла да Кёнігсберга. — А. В.) Генерал Болдзін быў адным з малалікіх савецкіх камандзіраў, якім удалося выйсці жывымі з пачатковага перыду вайны. Беластоцкі корпус быў адным з найлепш узброеных савецкіх фарміраванняў, у ім налічвалася звыш тысячы танкаў не толькі старэйшых, але і найбольш на той час мадэрных; падобна ўзброены корпус быў яшчэ ў Львове, а яго камандуючым быў вядомы пазней генерал Уласаў.

Гэтыя савецкія часці дайшлі да лініі Кузніца — Індура. Танкам не стала паліва, старыя танкі, якіх у корпусе былі дзве трэці, былі зношаныя, псаваліся. А ў новых танках быў неабучаны экіпаж і яны таксама былі, па сутнасці, небаяздольныя. Даставіць паліва і запасныя часткі было аднекуль, бо нямецкая авіяцыя бамбіла склады і вайсковыя калоны на дарогах, а казармаў не бамбіла. Так як і склады, немцы ў пачатку вайны збамбілі аэрадромы каля Заблудава і Бельска, дзе немаскіраваныя самалёты стаялі ў радках і іх было вельмі зручна знішчаць.

З 26 чэрвеня рэгулярных баёў на захад ад лініі Керзана ўжо не было. У той жа дзень немцы ў раёне Мінска закрылі кацёл з савецкімі войскамі. Рэгулярныя ваенныя дзеянні перанесліся далёка на ўсход ад Беласточчыны, вярнуўшыся сюды тры гады пазней.

Я тут прадставіў толькі павярхоўныя накіды суцэльнага вобразу пачаткаў другой сусветнай вайны, які стараецца больш дэталёва даследаваць спадар Нікалаюк. Перад ім яшчэ процьма працы, дзеля якой я жадаю яму вытрымкі. І поспехаў.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

ВЫСЛАЛІ Ў ШАХТУ

Росціку Назаруку 74 гады. Яго біяграфія, здавалася мне, нічым асаблівым не вылучаецца ад біяграфіі іншых валянскіх пенсіянераў. Аднак тое, што пачуў я ў Міхала Леўчука ад ягонага дзядзькі, аказалася надта цікавым.

— Пры саветах у нашай хаце зрабілі склад зброі, — пачынае мой суразмоўца. — Мы займалі кухню, а ў пакоі кватараваўся афіцэр з жонкаю. Была цяжарная. Дом ахоўваўся кругласутачна. Вартаўнік чужых на панадворак не прапускаў. Неаднойчы я цішком запускаўся на склад і выносіў кулі. Як пачалася вайна, афіцэр падаўся ў часць і не вярнуўся. Жонка засталася. Неўзабаве прыехалі энкавэдысты і яе забралі. На станцыі ў Чаромсе пагрузілі яе ў вагон і разам з іншымі адправілі ў напрамку Бельска-Падляшскага. Паміж Рэпчычамі і Кляшчэлямі цягнік быў разбіты нямецкім танкам. Лёс людзей, якія там знаходзіліся, мне невядомы.

Пры немцах засталіся мы жыць у сваёй хаце. Бацька апрацоўваў гаспадарку, займаўся бандаркай, лічыўся вядомым майстрам. Роўнымі яму былі Сцяпан Верамчук, Аляксей Назарук ды некалькі іншых.

Валянскія бандарскія вырабы добра прадаваліся на рынку ў Кляшчэлях. У панядзелак раніцай мужыкі выязджалі з таварам, а адвячоркам са справункамі вярталіся назад. У вайну наша сям'я не пацярпела страт у людзях, апрача таго, што старэйшага брата, Васіля, забралі на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Быў ён вязнем Штутгафа. Пасля вызвалення канцлагера трапіў да рускіх. У час допытаў палічылі яго нямецкім палонным і саслалі, стаў каторжнікам. У пяцідзесятых гадах яго апраўдалі і, як грамадзяніну Польшчы, у рамках рэпатрыяцыі, дазволілі вярнуцца дамоў. Падобны лёс спаткаў мяне ў Народнай Польшчы. А было гэта так. У пяцідзесятых гадах прызвалі ў армію. На першай камісіі адтэрмінавалі мяне як адзінага кармільца сям'і. Год пазней таксама, але ў час размовы з камісіяй я прызнаўся, што брат жыве ў Амерыцы. Праўда, ён намнога старэйшы за мяне і я ніколі яго не бачыў, але камісіі гэтага было дастаткова, каб даць чарговую адтэрміноўку, а за трэцім разам, а было гэта 14 лютага 1955 года, прызначыць у Ваенны горнапрамысловы корпус у горад Катавіцы, які тады называўся Сталіногруд.

Наша часць лічыла больш за 3 000 людзей. Камандзір быў у званні палкоўніка, а шэф штаба ў званні маёра. Кватараваліся мы ў казармах. Працавалі 900 метраў пад зямлёю. Адпраўляліся ў ніз ліфтам у адных трусіках. Мундзіры і дакументы здавалі жанчынам, якія выдавалі нам шахцёрскія ліхтары і спецыяльныя значкі. Спецтэхнічнымі работнікамі працавалі цывільныя. Салдаты накідалі вугаль на транспарцёры, затым пасылалі на ваганеткі і ліфтам адпраўлялі наверх. Харчавалі нас тры разы ўдзень. Па-рознаму бывала, раз горш, раз лепш. У святочныя дні на трох салдат выдавалі бутэльку віна. Давалі па дзесяць папяросаў штодзень. Плацілі таксама грошы. Зараз не памятаю якую суму, але пасля палучкі хапала купіць у салдацкай сталовай піва ці гарэлку. Мне выпала на долю служыць, калі маршалам Польшчы быў Канстанцін Ракасоўскі.

У арміі царыла дысцыпліна. Пропускаў не выдавалі. У водпуск цяжка было паехаць. Пад канец службы я пацярпеў ад удару электратоку, спаліла мне нагу. Першую дапамогу атрымаў у вайсковай амбулаторыі, затым на дваццаць дзён адправілі ў водпуск. Пасля выпадку шэф штаба не дазволіў працаваць пад зямлёю і прызначылі мяне да вартаўнічай службы. Там заставаўся да часу ўвальнення з арміі. Было гэта пад канец 1956 года. Са мною разам служылі многія хлопцы з Гайнаўшчыны і Бельшчыны. Памятаю, што з Арэшкава хтосьці быў. Мне пашанцавала, бо дамоў вярнуўся, хоць са здароўем зараз ненайлепш. Іншыя загінулі ў шахцёрскіх катастрофах або сталі інвалідамі.

Пасля арміі вярнуўся я на бацькаву гаспадарку. Потым у лесе працаваў сталым работнікам, аж да выхаду на пенсію.

Зараз адно ўспаміны з войска засталіся, ды некалькі залатовак дадатку да пенсіі за цяжкія ўмовы працы на шахце, — закончыў свой аповед Росцік Назарук з Вулькі-Тэрахоўскай, з якім я меў прыемнасць сустрэцца ў час свайго падарожжа.

Уладзімір СІДАРУК

Каб крытыкаваць, то трэба ведаць

Трымаю „Ніву” н-р 5 ад 29.01.06 г., у якой змешчана многа вестак прысвечаных польскаму паўстанню 1863 года і беларуска-расійскім адносінам. Звяртаю ўвагу на артыкул Мікалая Панфілюка „На скрыжаванні” і каментар „Наш жэўжык” газетнага рэдактара. Я чытаю ўсе артыкулы М. Панфілюка і знаю, што ён часта робіць недарэчнасці, але тым разам напісаў лагічную праўду, а крытык-„жэўжык” бухнуў стапаверхнасную недарэчнасць. Ён напісаў, што „з рускай літаратурай можа зраўняцца літаратура жыдоўская (якой крытык не знае), таму што Аляксандр Пушкін быў яўрэем (такога адкрыцця нават гітлераўцы не зрабілі), а сведчыць тое, што ён ведаў французскую і лацінскую мовы (веданне якіх напэўна не зрабіла А. Пушкіна дурным, а мовы гэтыя зналі тады амаль усе памешчыкі, адукаваныя людзі і афіцэры Расіі), а таксама насіў пэйсы”. Цяпер ва ўсім свеце забаронена ацаняць людзей па іх пэйсах, бародах. Важныя ў іх чалавечнасць, веды і талент. А. Пушкін не скрываў таго, што яго продак быў неграм, які быў на службе ў цара Пятра I Вялікага. Па ім Аляксандр меў кучаравыя чорныя валасы, што не пашкодзіла яму быць геніяльным рускім паэтам, вядомым ва ўсім культурным свеце. Я маю кніжку прозы А. Пушкіна, перакладзеную на нямецкую мову яшчэ пры панаванні кайзераў.

Калі ў 1945 г. немцы ўцякалі перад фронтам і ў сваіх дамах пакідалі піяніна з кучамі нот, я пацікавіўся які рэпертуар немцы іграліі. Аказалася, што іграліі яны творы нямецкіх кампазітараў (30%), італьянскіх (30%), рускіх (30%) і астатніх розных (10%). Настаўнік з Бельска, добра вядомы мне Яўген Евец, перад вайною працаваў на Польскім радыё, а пры савецкай уладзе 1939-1941 гадах — у рускай дзесяцігодцы ў Бельску і выкладаў там беларускую мову і спевы, пасля вайны апынуўся ў Заходняй Нямеччыне і стварыў там з эмігрантаў хор, які спяваў рускія, беларускія і ўкраінскія песні. Яго бацька, Іван Евец, паказаў мне ў Бельску здымкі, як амерыканскія і англійскія салдаты апладзіруюць выканаўцам твораў славянскіх кампазітараў. Якімі нішчожнымі пры іх выглядалі на сцэне грымасы, скачкі, крыкі і завыванні амерыканскіх акцёраў.

Сёння ніхто ў цягніках ужо не спявае — засталіся толькі фэсты

У 1937 г., калі А. Гітлер яшчэ не ўмацаваўся ў сядле, нямецкая кінастудыя „De-Fa” выпусціла цудоўны фільм „Была шумная ноч” аб жыцці і творчасці геніяльнага рускага кампазітара Пятра Чайкоўскага (1840-1893). Ролю каханай П. Чайкоўскага сыграла сусветнавядомая нямецкая актрыса і спявачка (альт) Цара Леандэр, па паходжанні шведка. У фільме быў паказаны балет з „Лебядзінага возера” П. Чайкоўскага, а ролю прымадоннаў у гэтым балеце выконвалі славутыя нямецкія балерыны Ла-Яна і Марыка Рок (па паходжанні мадзьярка). Нямецкія фільмы, не маючыя гітлераўскага зместу, савецкія ўлады дазволілі паказваць у кінатэатрах савецкай зоны ў Германіі, і я гэты фільм глядзеў некалькі разоў. У 1936 г. на фестывалі царкоўнага спявання рускі праваслаўны хор пад кірункам Афанасьева заняў першае месца ў свеце. Сталінскія палітыкі і журналісты ведалі, што „паўяўрэй” В. Ленін напісаў, дзе сказаў і калі голасна выпусціў паветра з кішэчніка, але слаба арыентаваліся ў гісторыі народаў, вобразаў іх думання і ў 1991 г. вялікі Савецкі Саюз рассыпаўся.

У санацыйнай Польшчы каталіцкі журнал „Unia” прызываў да нетаалерантнасці супраць беларусаў і ўкраінцаў — пішучы, што „мы хочам прыязнасці з беларусамі і з украінцамі, але з тымі беларусамі і ўкраінцамі, якія пражываюць за савецкай граніцай, але не можа быць талерантнасці ў адносінах да беларусаў і ўкраінцаў пражываючых на ўсходніх землях Польшчы”. І былі апрацаваны метады, як абыходзіцца з імі. Чытаючы гэтыя рэкамендацыі складваецца ўражанне, што гэта рэкамендацыі сатаны. На жаль, пад многімі рэкамендацыямі віднеліся часта подпісы слугаў Ватыкана. Відны польскі гісторык Марцэлі Гэндэльсман (+1981) у сваёй кніжцы „W 25 pułku ułanów” канстатуе, што беларусы, апрача сваёй слабой культуры, апіраюцца на прывабную рускую культуру, аб чым яны не гавораць, але што можна прыкмеціць па іх паводзінах і дае рады як змагацца з тым палажэннем; даць беларусам беларускія школы, да якіх падставіць праверaных прапольскіх настаўнікаў і прафесараў, замаскіраваных палякаў. Калі нам, палякам, гэта ўдасца, то тады будзем рабіць з беларусамі, што нам захочацца. Разумны наглядальнік лёгка прыкмеціць, што цяпер некаторыя намінальныя беларускія дзеячы, літаратары і настаўнікі дзейнічаюць так, як гэта рэкамендаваў прафесар М. Гэндэльсман.

У нашым выпадку, карэспандэнт „Нівы” з сяла Дубічы-Царкоўныя Мікалай Панфілюк правільна напісаў тым разам аб рускай культуры, а больш пісьменны яго апанент тым разам моцна памыляецца, хаця вакол на кожным кроку мае прыклады нядобразычлівасці і варожасці лехітаў. Я перад вайной пабываў у Беластоку і на кожным кроку на вуліцах можна было пачуць размовы на яўрэйскай, рускай, беларускай і ўкраінскай мовах і грамадзяне не баяліся размаўляць не па-польску, нават у прысутнасці паліцыянта. Двухаблічныя кіраўнікі Народнай Польшчы, прыкрываючыся лозунгам інтэрнацыялізму і прыязні з зарубежнымі народамі, не прызнавалі існавання іншых у сваім краю. Для адбудовы адсталай, разбуранай і неграватай Польшчы трэба было многа сіл і беларусы атрымлівалі сярэднюю, вышэйшую адукацыю і значныя пасты, але не мелі магчымасці выхоўваць сваіх патомкаў у сваім нацыянальным духу. І рабіліся гэта пад бокам сталінскіх тупіц. Я тады часта ездзіў цягнікам на поўдзень Беластоцкага ваяводства і назіраў такую карціну: вячэрнім цягнікам у нядзелю вярталася ў Беласток многа моладзі — хлопцаў і дзяўчат і, пачынаючы ад станцыі ў Сямятычах, на кожнай станцыі прыбаўлялася расповедаў моладзі, якая спявала ўкраінскія і рускія песні. У Бельску перасядала з цягніка, які прыйшоў з Нараўкі, Гайнаўкі і Белавежы, таксама расспяваная моладзь, якая спявала беларускія і рускія песні. Далейшая язда ў Беласток суправаджалася пад прыгожы спеў, і кандуктары не забаранялі рабіць такія „канцэрты”. У клубе ваяводскай міліцыі ў Беластоку ў суботу вечарам можна было пачуць падобныя спевы. Але прыйшоў кастрычнік 1956 года і гамулкаўскі пераварот, які суправаджаўся дзікімі шавіністычнымі дзеяннямі палякаў. Спяваць прыгожыя песні суседніх славянскіх народаў было забаронена, у Міхалове польскія „дэмакраты” зрабілі паленне беларускіх кніг. Распушчана амаль усе вакальныя польскія калектывы, у тым ліку беластоцкі калектыў „Транспартовец”, у якім спявала і многа беларускіх дзяўчат, пад умелым кіраўніцтвам Ежака. Забаронена спяваць у цягніках, зніклі спевы міліцыянераў у сваім клубе. Зменена праграма радыё і кіно. Узмоцніліся атакі на беларускае Таварыства і „Ніву”, якія ўзніклі вясною 1956 года.

Мікалай КАПЧУК

Чаму загінуў?

Невялікая вёска Дзікае раскінулася над Супраслю, непадалёк Беластока. Стагоддзямі жылі тут мірна каталіцкія палякі і праваслаўныя беларусы. 1944 год прынёс ім вызваленне з-пад гітлераўскай акупацыі і заадно змяніў адносіны паміж людзьмі. Узніклі тады падпольныя арганізацыі, якія імкнуліся вярнуць лонданскі ўрад і аднавіць II Рэч Паспалітую — краіну бяды, нэндзы і беспрацоўя. У гэтай вёсцы таксама аб'явіліся маладыя людзі — прыхільнікі гэтай ідэі, а ў іх ліку „Шах”, завербаваны „Колам” — камандзірам ліквідацыйнай ячэйкі (загінуў ён 11 снежня 1946 г.).

У той дзень, калі загінуў Аляксандр Ханеўскі, „Кола” і „Шах” з'явіліся ў вёсцы, каб памяняць бялізну. Брат „Кола” паведаміў ім, што ў вёсцы знаходзіцца згаданы Аляксандр. Тады разам з жыхарамі вёскі Барсукоўка „Рэнам” і „Віхрам” зайшлі яны да Пятра Астроўскага, у якога знаходзіўся пацярпелы. „Рэн” і „Віхэр” вывелі яго з хаты і павялі за „Колам” ва ўрочышча Курган, дзе „Кола” ў жахлівы спосаб закатаваў яго, раней забіраючы кажух і шапку. Труп закапалі яны на месцы злачынства.Пасля арыштавання „Шах” прызнаўся да забойства і паказаў месца, у якім закапалі яны цела.

Сястра забітага жыла ў вёсцы разам з бацькамі. Паведаміла яна, што прычынай забойства быў факт, што сям'я была праваслаўнай. Падпольнікі рабавалі маёмасць і білі бацьку толькі за тое, што не хацеў выехаць з вёскі ў Беласток. У выніку прыдзірак і пагроз сям'я вымушана была пакінуць вёску.

30 кастрычніка 1946 г. Аляксандр Ханеўскі прыехаў у вёску, на бацькаву гаспадарку, за харчамі. Пад вечар на лузе заўважыў „Кола” і „Шаха”, аб чым паведаміў сваю сястру Жэню, якая прасіла яго не ісці вечарам на калёнію Фасты.

Паводле заключэння медыцынскай экспертызы, Аляксандр Ханеўскі атрымаў удар тупой прыладай у правую скіўцу і ў лоб, у выніку чаго страціў прытомнасць. У такім стане закапалі яго ў зямлю. Ад недахопу кісларoду непрытомны чалавек задыхнуўся.

Адказ на пастаўленае ў загалоўку пытанне трэба шукаць у Беластоцкім аддзеле Інстытута нацыянальнай памяці. **(эмка)**